ФІНАЛІСТЫ КОНКУРСУ «СЯМ'Я 2019 ГОДА» Сямейная газета

МЫ З МАМАЙ — БАЛЕРЫНЫ Сямейная газета



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 КАСТРЫЧНІКА 2019 г. ЧАЦВЕР № 193 (29060)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар БРЫЛА, намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«Вытворчасць малака — адна з самых эфектыўных галін жывёлагадоўлі. Рэнтабельнасць яго продажу летась — 18,7 %, за першае паўгоддзе сёлета — 19,3 %. Растуць і аб'ёмы: за восем месяцаў гэта 100,1 % да мінулага года пры надоі ад каровы 3403 кілаграмы. З плюсам працавалі гаспадаркі і ў верасні. Дасягнуты ўзровень вытворчасці дазваляе забяспечыць выкананне пастаўленай на гэты год задачы — атрымаць больш за 7270 тысяч тон малака, або 103,3 % да папярэдняга года пры надоі ад каровы не менш за 5180 кілаграмаў».*

# БЫЎ ТАКІ ПОРТ — БЕШАНКОВІЧЫ...



**Адзіная ў Беларусі якарная алея знаходзіцца ў раённым цэнтры Бешанковічы. Алея складзена з экспанатаў калекцыі Андрэя ТРУБЕЦКАГА *(на фота)* — мясцовага майстра на ўсе рукі, краязнаўца, аквалангіста, які заняўся пошукамі рачных якароў на дне Заходняй Дзвіны побач з родным горадам. У калекцыі Андрэя было дваццаць шэсць вялікіх і малых якароў, восем з якіх ён ахвяраваў на памятную алею.**

**— Мемарыяльная якарная алея — памяць пра заснавальнікаў нашага горада, мужных землякоў-рачнікоў, — кажа Андрэй Віктаравіч. — Бешанковічы заўсёды былі партовым і гандлёвым цэнтрам на Заходняй Дзвіне.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

**• Фізічны пуск першага энергаблока Беларускай АЭС плануецца ў студзені 2020 года.**

• У перапісе насельніцтва, па звестках на 9 кастрычніка, прыняло ўдзел звыш 1 500 000 грамадзян Беларусі.



**• Колькасць уладальнікаў дзвюх і больш кватэр вырасла ў Віцебскай вобласці амаль на 13 % у параўнанні з 2018 годам.**

• Нацыянальная акадэмія навук Беларусі сфарміравала па даручэнні ўрада пералік «праектаў будучыні».

**• Жыхар Полацка скокнуў з моста ў Заходнюю Дзвіну. Мужчына знаходзіцца ў шпіталі, спробы суіцыду ён рабіў і раней.**

ISSN 1990 - 763X

Разумныя грошы

# ЯК ВЫПЛАЦІЦЬ «НЯПРАВІЛЬНЫ» КРЭДЫТ?

## Што рабіць, каб пазычаная «дробязь» не павялічылася ў разы

**Вядома, са з'яўленнем на нашым рынку крэдытавання жыццё стала значна прасцей. Можна не чакаць зарплаты, каб купіць жаданую рэч, і не адкладаць гадамі на адпачынак. Але часцяком з-за няправільных разлікаў крэдыт становіцца цяжкай ношай, пазбавіцца ад якой няпроста.**

### Чым пагражае нявыплата доўгу?

У выпадку пратэрміновак плацяжоў кліенту можа быць налічана няўстойка, пеня, выстаўлена патрабаванне вярнуць усю суму доўгу аднаразова. Другое — надыходзіць маёмасная адказнасць. Яна выяўляецца ў канфіскацыі закладной маёмасці паводле дагавора (такой, як аўтамабіль, банкаўскія рахункі і іншая маёмасць). Нарэшце, у залежнасці ад сумы доўгу пазычальніку могуць пагражаць пазбаўленне волі або прымусовыя работы па рашэнні суда. Але, як правіла, банкі выкарыстоўваюць для вяртання доўгу менавіта фінансавыя рычагі. Адным з такіх інструментаў з'яўляецца рэструктурызацыя крэдыту. А пакуль вось некалькі парад, як бязбольна і хутка пазбавіцца ад надакучлівых запазычанасцяў.

СТАР. 4

Актуальна

# ЧАС АБАРАНЯЦЦА АД ГРЫПУ

**Як праходзіць вакцынацыя ў сталічных паліклініках, дзе за тыдзень прышчапілася больш за 95 тысяч мінчан**

**«Чарга ў працэдурны кабінет па прышчэпку ад грыпу пакуль невялікая — некалькі чалавек. Звычайна яна павялічваецца, калі перыяд вакцынацыі заканчваецца: усе, хто адкладваў, раптам вырашаюць прышчапіцца», — каментуе Вольга ЕСМАНЧЫК, галоўны ўрач 39-й сталічнай паліклінікі. Перад кабінетам і сапраўды людзей няшмат, сярод іх — і ўрачы гэтай жа паліклінікі. Медработнікі ўваходзяць у групу рызыкі і прышчапляюцца ў абавязковым парадку. З пачатку кастрычніка ў краіне пачалася сезонная вакцынацыя ад грыпу, яна працягнецца да 1 снежня. За гэты час плануецца прышчапіць 40 % насельніцтва, што дазволіць не дапусціць эпідэміі гэтай інфекцыі.**



СТАР. 13

# САДРУЖНАСЦЬ ЗВЯРАЕ ГАДЗІННІКІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 10—11 кастрычніка наведвае з рабочым візітам Туркменістан**

**Пра гэта паведамляе афіцыйны інтэрнэт-партал кіраўніка дзяржавы. Прэзідэнт у Ашгабаце прыме ўдзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД. На парадку дня саміту значацца пытанні, якія датычацца развіцця ўзаемадзеяння ў рамках інтэграцыйнага аб'яднання, уключаючы сферу стратэгічнага эканамічнага супрацоўніцтва, узаемадзеянне ў праваахоўнай і ваеннай галінах, барацьбу з тэрарызмам і экстрэмізмам.**

Чакаецца, што 11 кастрычніка пасяджэнне Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД пачнецца з абмену думкамі аб узаемадзеянні ў рамках СНД і абмеркавання пытання аб старшынстве ў СНД у 2020 годзе, паведамляе прэс-служба Выканаўчага камітэта СНД.

На разгляд прэзідэнтаў плануецца вынесці шэраг папярэдне ўзгодненых міністрамі замежных спраў Садружнасці дакументаў. Гэта перш за ўсё праект Звароту кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў да народаў краін Садружнасці і сусветнай грамадскасці ў сувязі з 75-годдзем Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў.

Чакаецца таксама падпісанне кіраўнікамі дзяржаў-членаў дакументаў, якія рэгламентуюць, у прыватнасці, супрацоўніцтва ў супрацьдзеянні карупцыі, барацьбе з тэрарызмам і іншымі гвалтоўнымі праявамі экстрэмізму, развіцці інфармацыйнага абмену паміж кампетэнтнымі органамі ў сферы бяспекі і правапарадку ў пытаннях барацьбы са злачыннасцю.

Акрамя згаданых дакументаў, на разгляд кіраўнікоў дзяржаў плануецца ўнесці праекты Дэкларацыі аб стратэгічным эканамічным супрацоўніцтве дзяржаў — удзельніц СНД і Канвенцыі аб перадачы выканання пакаранняў, не звязаных з пазбаўленнем волі.

Аляксандр Лукашэнка на палях саміту традыцыйна правядзе таксама серыю перагавораў са сваімі замежнымі калегамі па тэматыцы двухбаковага супрацоўніцтва.

***

На пасяджэнні Савета Міністраў замежных спраў СНД, якое адбудзецца ў Ашгабаце сёння, 10 кастрычніка, кіраўнікі знешнепалітычных ведамстваў абмяняюцца думкамі па актуальных пытаннях міжнароднага парадку дня і ўзаемадзеяння ў фармаце СНД, прымуць Праграму дзеянняў па актывізацыі партнёрства паміж знешнепалітычнымі ведамствамі дзяржаў — удзельніц СНД, разгледзяць пытанні аб Гульнях краін СНД, забеспячэнні інфармацыйнай бяспекі дзяржаў — удзельніц СНД, стварэнні Сумеснай (аб'яднанай) сістэмы сувязі ўзброеных сіл, барацьбе з незаконным абаротам наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і прэкурсораў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## У тэму

**Беларусь і Туркменістан могуць знайсці кампраміс па праблемных пытаннях, якія ўзніклі падчас рэалізацыі праекта будаўніцтва Гарлыкскага горна-ўзбагачальнага камбіната. Аб гэтым у Ашгабаце напярэдадні саміту СНД расказаў журналістам пасол Беларусі ў Туркменістане Вячаслаў БЯСКОСТЫ, перадае карэспандэнт БелТА.**

Пасол адзначыў, што 9 кастрычніка адбылася цырымонія ўручэння даверчых грамат і яго сустрэча з Прэзідэнтам Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедавым. «Гатоўнасць туркменскіх калег я бачу. Яны гэта адкрыта дэманструюць. Сёння на сустрэчы Гурбангулы Бердымухамедаў пацвердзіў, што туркменскі бок гатовы да кампрамісу», — заявіў дыпламат.

Дыпламат не выключыў, што адпаведнае пытанне будзе абмяркоўвацца ў Ашгабаце на вышэйшым узроўні з удзелам кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі.

«Мы дамовіліся з туркменскім бокам, што ні ў якім разе тая сітуацыя, якая цяпер склалася з Гарлыкскім ГУКам, не павінна любым негатыўным чынам уплываць на ўсе іншыя кірункі супрацоўніцтва, а такіх кірункаў маса», — падкрэсліў пасол.

Вячаслаў Бяскосты не ўдакладніў, пра што менавіта могуць дамовіцца Беларусь і Туркменістан у дачыненні Гарлыкскага ГУКа. «Па выніках кантактаў будуць выпрацаваны ўзаемапрымальныя рашэнні, у якім кірунку ўрадам нашых краін рухацца, каб прасунуць гэты праект. Канчатковая мэта — вывесці яго на нармальную работу», — сказаў дыпламат.

Пасол растлумачыў, што сутнасць канфлікту вельмі шматгранная. «У любым канфлікце няма аднаго боку, які нясе цалкам віну або адказнасць. Гэты праект не выключэнне. Думаю, тут ёсць доля віны кожнага з бакоў, — сказаў ён. — Наш падыход і наша бачанне гэтай сітуацыі заключаецца ў тым, што туркменскі бок на нейкім этапе спыніў фінансаванне работ па завяршэнні будаўніцтва ГУКа. Адпаведна, нашы спецыялісты былі вымушаныя прыняць рашэнне аб прыпыненні будаўнічых і наладачных работ. Таму склалася такая сітуацыя, утварылася ўзаемныя прэтэнзіі, бакі адзін на аднаго падалі ў міжнародны арбітраж Гандлёвай палаты Стакгольма».

## Парламенцкі дзённік

# Зроблена шмат. Мае быць яшчэ больш

**Умацоўваць адносіны з Германіяй трэба праз інвестыцыйнае і інавацыйнае супрацоўніцтва**

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Пасло Германіі Манфрэдам ХУТЭРЭРАМ.**


Фота БелТА.

«Германія з'яўляецца нашым важным гандлёва-эканамічным партнёрам — 3,3 мільярда долараў таваразварот за 2018 год, сёлета — 1,7 мільярда. Мы зацікаўлены ў развіцці гэтых адносін. І ў цэлым лічым, што ўмацоўваць нашы адносіны трэба праз новыя інвестыцыйныя і інавацыйныя праекты», — акцэнтаваў увагу спікер ніжняй палаты парламента.

Нямецкі бок у сваю чаргу прапаноўвае прыходзіць у Беларусь не толькі буйным інвестарам, але і прадстаўнікам малога і сярэдняга бізнесу, які значна развіты ў Германіі.

У апошнія гады кантакты парламентарыяў дзвюх краін актывізаваліся. Павялічылася колькасць візітаў, эфектыўна ўзаемадзейнічаюць дэпутаты на арэне Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Нямецкія дэпутаты выступалі суаўтарамі некаторых беларускіх рэзалюцый у гэтай арганізацыі. Разлічвае беларускі бок на падтрымку Германіі дзеля атрымання статусу наглядальніка ў Парламенцкай канферэнцыі Балтыйскага мора.

Адсутнасць пагадненняў па супрацоўніцтве паміж парламентамі кампенсуецца работай груп дружбы.

«Мы высока цэнім унёсак Германіі па нармалізацыі і развіцці палітычнага дыялогу Беларусі з Еўрасаюзам. Выразны прыклад падтрымкі з боку Германіі — будучае спрашчэнне візавага рэжыму», — сказала **старшыня Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы, намеснік кіраўніка рабочай групы па супрацоўніцтве з Парламентам Германіі Таццяна Кананчук.**

«Адной з тэм падчас усіх сустрэч для абмеркавання з'яўляецца развіццё супрацоўніцтва па лініі грамадскіх аб'яднанняў Беларусі і Германіі, гуманітарнае супрацоўніцтва», — адзначае Таццяна Кананчук.

Дэпутаты гатовы і далей развіваць адносіны з Германіяй, эканоміку якой называюць лакаматывам не толькі ў Еўрапейскім саюзе, але і ў свеце.

Бязвізавы рэжым для жыхароў Германіі дапамог прыцягнуць у нашу краіну ў 2018 годзе 4000 турыстаў. Беларускія дэпутаты разлічваюць на такія ж меры для нашых грамадзян.

Манфрэд Хутэрэр адзначыў: падчас сваёй місіі мае намер паглыбіць супрацоўніцтва дзяржаў. Ён анансаваў у будучым годзе візіт у Мінск парламенцкай групы з Германіі. «Вядома, эканоміка — фундамент нашых адносін, але і сацыяльныя ініцыятывы, якія развіваюцца ўжо амаль 30 гадоў, гэта вельмі важна», — лічыць дыпламат.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## Выбары-2019

# НАЗІРАЛЬНІКІ АБ'ЯДНАЛІСЯ

**У Мінску стварылі штаб па каардынацыі дзейнасці назіральнікаў падчас правядзення выбараў у Палату прадстаўнікоў сёмага склікання**


Фота БелТА.

**Пра тое, што гэта за структура і чым яна будзе займацца бліжэйшы месяц, «Звязда» распытала Міхаіла БАТУРУ, старшыню Мінскага гарадскога каардынацыйнага савета грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый, пры якім створаны штаб.**

**Прафесар і доктар тэхнічных навук Міхаіл БАТУРА**, былы рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, узначальвае Мінскую гарадскую арганізацыю РГА «Белая Русь». Ён расказаў, што Мінскі гарадскі каардынацыйны савет грамадскіх арганізацый і палітычных партый быў створаны ў студзені 2010 года.

— Мы і раней сустракаліся на розных мерапрыемствах грамадска-палітычнага характару. Ідэя каардынацыі ўзнікла, каб можна было сумесна рыхтавацца да такіх мерапрыемстваў, падзяляць функцыі паміж аб'яднаннямі і партыямі. Каардынацыйны савет — аб'яднанне аднадумцаў, якія прадстаўляюць розныя групы людзей, каб узгоднена ўдзельнічаць у працэсах у краіне і пры гэтым не дубліраваць адно аднаго, не заходзіць на «чужое поле», — патлумачыў Міхаіл Батура.

«Мы распрацавалі і зацвердзілі статут, але каардынацыйны савет — не юрыдычная арганізацыя, — заўважыў яго кіраўнік. — Гэта досыць эфектыўная структура. Мы ўсе ведаем адно аднаго. Цяпер у савет уваходзяць 16 грамадскіх аб'яднанняў і шэсць партый ад Мінска».

Гэта вельмі невялікая частка ад існуючых грамадска-палітычных сіл сталіцы, дадаў Міхаіл Батура. Каардынацыйны савет аб'яднаў, па словах яго старшыні, лідараў канструктыўных рухаў. «Тых, хто вельмі рэзкі ў сваіх меркаваннях, прыхільнікаў пратэсту, мы не запрасілі. А ў статут запісалі: прымаем канструктыўныя грамадскія аб'яднанні і палітычныя партыі, і, больш за тое, з рэкамендацыямі двух членаў каардынацыйнага савета», — расказаў лідар Мінскай гарадской арганізацыі ГА «Белая Русь».

Ён звярнуў увагу, што пасяджэнні каардынацыйнага савета праходзяць у спакойнай абстаноўцы, без узаемных абвінавачванняў, у духу пошуку плённых, узгодненых рашэнняў.

На рэспубліканскім узроўні падобны каардынацыйны савет пакуль не створаны, але такія ёсць у некаторых раёнах і абласцях. «Яны ствараюцца не на нейкім прадпісанні, а з-за жадання людзей з агульнымі інтарэсамі, зацікаўленых у развіцці грамадства, у паляпшэнні дабрабыту, калі яны пры гэтым прытрымліваюцца спакойнага стылю ў выпрацоўцы рашэнняў», — падкрэсліў прафесар.

Мінскі гарадскі каардынацыйны савет грамадскіх арганізацый і палітычных партый узаемадзейнічае з гарадскім выканаўчым камітэтам сталіцы. «Цяпер у нас вельмі ўраўнаважанае супрацоўніцтва. Пасля стварэння каардынацыйнага савета ўдзел у мерапрыемствах, якія ладзіць горад, стала прымаць удвая больш мінчан — членаў аб'яднанняў і партый, бо мы іх мабілізуем», — лічыць Міхаіл Батура.

Грамадскія аб'яднанні і партыі, як правіла, актыўна ўдзельнічаюць ва ўсіх электаральных кампаніях. Сталічнае падраздзяленне «Белай Русі» імкнецца вылучыць сваіх прадстаўнікоў у Мінскую гарадскую, акруговыя і ўчастковыя выбарчыя камісіі, а таксама акрэдытаваць іх назіральнікамі. Тое самае робяць і іншыя члены каардынацыйнага савета. «Калі мы падводзілі вынікі мінулых выбарчых кампаній, то адзначалі, што некаторыя нашы прадстаўнікі аказаліся недастаткова актыўныя. Таму сёлета ўзнікла ідэя стварыць Штаб па каардынацыі дзейнасці назіральнікаў падчас правядзення выбараў дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, які працаваў бы сістэмна, — паведаміў кіраўнік каардынацыйнага савета. — Што мы і зрабілі. У штаб увайшлі дзевяць найбольш вопытных членаў аб'яднанняў і партый, сярод якіх не толькі кіраўнікі».

Міхаіл Батура ўзначаліў штаб. «Цяпер наша задача — арганізаваць навучанне назіральнікаў, а іх больш за 1000 чалавек. Дзякуючы структурам партый і грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку «Белай Русі», у якой ёсць раённыя арганізацыі, мы праводзём навучанне ў кожным раёне горада. Гэта планы на першую палову кастрычніка», — падзяліўся кіраўнік штаба.

Асноўная работа назіральнікаў праходзіць падчас галасавання. На гэты перыяд штаб арганізуе дзяжурства. Новая структура будзе не толькі дапамагаць назіральнікам, але і акумуляваць інфармацыю аб галасаванні, а потым аналізаваць работу сваіх актывістаў.

«Выбары — гэта вельмі адказны для краіны перыяд, важны для грамадства. Пры любых калізіях патрэбна спакойнае абмеркаванне і выказванне пазіцый, каб знайсці выйсце, — лічыць Міхаіл Батура. — Гэта магчыма ў любой сітуацыі, калі няма іншай мэты. Наша мэта — правесці выбары ў адпаведнасці з законам. Любыя абставіны маюць тлумачэнні. Заўсёды можна вырашыць спрэчку з павагай да апанента. Для нас самае галоўнае — згода».

Старшыня штаба прывёў у прыклад прыгожыя акцыі «Белай Русі», такія як «З любоўю да дзяцей», якія ні ў кога не выклікаюць папроку. «У нас няма жадання ладзіць нейкія неадназначныя акцыі, — сказаў ён. — Таму нас разумеюць. Нас можна абвінаваціць толькі ў тым, што мы робім мала, бо добрага не бывае зашмат. Таму наша задача — ядналне вакол пазітыву, якога павінна быць больш».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ВАЖНЕЙШЫЯ ЗАДАЧЫ МЯСЦОВАЙ УЛАДЫ

**Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Іван ЛАЎРЫНОВІЧ правёў прамую лінію і асабісты прыём грамадзян у Мастоўскім райвыканкаме**

**Падчас прамой лініі паступіла каля дзесяці званкоў, таксама шэраг пытанняў быў агучаны на асабістым прыёме грамадзян.**



У прыватнасці, пенсіянерка з Мастоў паскардзілася на адсутнасць асвятлення ў індывідуальных ячэйках у падвале. Аказалася, што падключэнне электрасілкавання магчыма толькі пры ўсталяванні лічыльніка ў падвале для кожнай ячэйкі. На такое рашэнне праблемы далі згоду толькі некалькі жыхароў з больш чым 180 дамоў райцэнтра. Таму прадстаўнікам ЖКГ дадзена даручэнне сустрэцца з жыхарамі дома і расказаць алгарытм дзеянняў у падобнай сітуацыі.

Асобна падчас прыёму была паднята тэма ацяпляльнага сезона. Іван Лаўрыновіч адзначыў, што ў цэлым у Гродзенскай вобласці нараканняў у гэтым плане няма. Ва ўсіх сацыяльных аб'ектах — садках, школах, бальніцах — цяпло ўключана, ідзе яно і ў жылы фонд. Важна і далей забяспечваць бесперабойную работу ацяплення.

«Цяпло, добраўпарадкаванне, стварэнне камфортных умоў для пражывання грамадзян — найважнейшая задача мясцовай улады», — падкрэсліў Іван Лаўрыновіч.

Зацікаўленым службам дадзена даручэнне ў самыя кароткія тэрміны прадставіць варыянты вырашэння праблемы жыхаркі Гродзенскага раёна. Жанчына не можа атрымаць тэхнічны пашпарт на пабудаваны дом, які аказаўся ў санітарнай зоне пабудаванага значна пазней свінакомплексу. Таксама ў самыя кароткія тэрміны неабходна разабрацца ў сітуацыі з дарогай у Слонімскім раёне. Па словах мясцовага жыхара, яму абяцалі вырашыць пытанне, але дарогу ў парадак не прывялі.

Жыхарцы вёскі Зарудаўе дапамогуць з нарыхтоўкай кармоў для каровы. Пра гэта падчас званка на прамую лінію папрасіў сын жанчыны.

Жыхары вёскі Дзенькаўцы папрасілі вырашыць пытанне з водазабеспячэннем населенага пункта. У раёне пра праблему ведаюць: праектна-каштарысная дакументацыя на экспертызе, плануецца прабіць новую свідравіну. Вызначана на гэта і неабходнае фінансаванне. Іван Лаўрыновіч узяў пытанне на кантроль, да снежня ўсё павінна быць вырашана.

Яшчэ адна сітуацыя стане прадметам разгляду адпаведных службаў. Пенсіянерка з Мастоў лічыць, што пераплачвае за электраэнергію, расходуючы ў месяц больш за 100 кВт/г, хоць электрапрыборамі, па яе словах, практычна не карыстаецца. Лічыльнік бралі на экспертызу. Працуе ён спраўна, аднак спецыялісты зноў абследуюць сеткі ў кватэры, каб зняць усе пытанні.

Паступіў і шэраг асабістых пытанняў. У прыватнасці, будзе дадаткова разгледжаны зварот жанчыны-ўрача аб перараазмеркаванні па месцы работы яе мужа, які таксама працуе медыкам.

«Падобныя мерапрыемствы ў раёнах — своеасаблівы індыкатар работы мясцовай улады. І на прыкладзе Мастоўскага раёна відаць, што невырашальных у глабальным плане пытанняў няма. У добрым стане дарогі, інфраструктура, сістэма ЖКГ раёна — усё гэта дазваляе людзям нармальна жыць і працаваць», — адзначыў Іван Лаўрыновіч. Ён падкрэсліў, што прычынай з'яўлення некаторых пытанняў становіцца проста недастатковае інфармаванне людзей.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

Футбол

# Мархель гатовы адкрыць сваю пераможную серыю

**Сёння зборная Беларусі па футболе правядзе чарговы матч у рамках адбору на чэмпіянат Еўропы 2020 года. Гасцямі стануць футбалісты з Эстоніі, гульня пройдзе на сталічным стадыёне «Дынама» ў 19.00. Завершыць восеньскую сесію матч са зборнай Нідэрландаў 13 кастрычніка.**



Галоўны трэнер беларусаў Міхаіл Мархель перад чарговымі стартамі адзначыў, што каманда ў абедзвюх сустрэчах будзе імкнуцца да перамог.

«З эстонцамі нам трэба згуляць хоць бы на ўзроўні, як мы згулялі ў Таліне і перамагчы, — сказаў паўабаронца зборнай Беларусі Ігар Стасевіч. — А каб дабіцца станоўчага выніку ў матчы з Нідэрландамі, павінна супасці шмат фактараў — удача, поспех і самааддача».

Канчатковы склад беларускай зборнай выглядае наступным чынам:

варатары: Аляксандр Гутар («Дынама-Брэст»), Антон Чычкан (БАТЭ), Ягор Хаткевіч («Іслач»);

абаронцы: Аляксандр Мартыновіч («Краснадар»), Дзяніс Палякоў («Урал», Екацярынбург), Сяргей Паліцэвіч («Кайрат», Алматы), Алег Вераціла («Дынама-Брэст»), Сяргей Матвейчык («Шахцёр», Салігорск), Захар Волкаў (БАТЭ), Мікіта Навумаў («Жэтысу», Талдыкарган), Мікалай Золатаў («Віцебск»);

паўабаронцы: Станіслаў Драгун, Ігар Стасевіч, Яўген Яблонскі (усе — БАТЭ), Павел Савіцкі («Дынама-Брэст»), Юрый Кавалёў, Макс Эбонг (абодва — «Шахцёр», Салігорск), Іван Маеўскі («Астана», Казахстан), Іван Бахар, Яўген Шаўчэнка (абодва — «Мінск»);

нападаючыя: Дзяніс Лапцеў («Дынама-Брэст»), Максім Скавыш (БАТЭ), Віталь Лісаковіч («Варажзін», Харватыя).

Перад чарговымі матчамі адбору да Еўра-2020 зборная Беларусі, маючы тры ачкі, знаходзіцца на чацвёртым месцы ў групе С, лідзіруе каманда Германіі, на другім месцы — Паўночная Ірландыя, на трэцім радку знаходзяцца Нідэрланды.

Цяпер зборная Беларусі ў рэйтынгу ФІФА займае 82-е месца, сярэдні ўзрост нашай каманды — 27,5 года.

10 кастрычніка Нідэрланды прымуць Паўночную Ірландыю, а 13 кастрычніка Эстонія згуляе з камандай Германіі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Факт

## Вызначаны 25 найлепшых

**Днямі завяршыўся прыём заявак і дакументаў на ўдзел у конкурсе на саіскание прэміі ўрада Беларусі за дасягненні ў галіне якасці 2019 года.**

Намер удзельнічаць у ім сёлета мела 121 арганізацыя. Па выніках аказаных ім кансультацый, папярэдняга адбору сакратарыятам камісіі па прысуджэнні прэміі, а таксама прынятых патэнцыяльнымі ўдзельнікамі рашэнняў аб удзеле ў спіс прэтэндэнтаў на званне лаўрэата былі ўключаны 25 арганізацый розных галін эканомікі.

Варта адзначыць, што найбольш вострая барацьба за званне лаўрэата чакаецца па кірунку дзейнасці «вытворчасць харчовай і сельскагаспадарчай прадукцыі». Сярод удзельнікаў гэтага мерапрыемства такія вядомыя арганізацыі, як Добрушскі фарфоравы завод, Слонімскі мясакамбінат і Гомельскі хімічны завод. Падрабязны спіс прэтэндэнтаў, якія выйшлі ў фінал, чытайце на нашым сайце zviazda.by.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## На продаж — Дом друку

**Улады выставілі на продаж Дом друку, які знаходзіцца каля станцыі метро «Акадэмія навук».**

Пачатковы кошт помніка архітэктуры 1930-х гадоў — 6,975 мільёна рублёў. Мэтавае прызначэнне — адміністрацыйна-дзелавое. Таргі адбудуцца 20 лістапада, паведамляе агенцтва «Мінск-Навіны». Будынак Дома друку пабудаваны ў 1930—1935 гадах у стылі канструктывізму. Збудаванне перажыло вайну, а ў 1963—1978 гадах яго рэканструявалі, надбудаваўшы чацвёрты паверх. Аб'ект будзе прадавацца па рыначным кошце, з заключэннем дагавора арэнды зямельнага ўчастка, неабходнага для абслугоўвання нерухомай маёмасці. Таргі пачнуцца з 6 мільёнаў 975 тысяч 687 рублёў 16 капеек.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Ідэя, крэатыў + беларуская мова

**8 кастрычніка ў Беларусі стартуе сацыяльна-адукацыйны праект «Першыя» — конкурс яскравых ідэй пакалення Z.**

На працягу навучальнага года яго ўдзельнікі будуць распрацоўваць сваю ідэю, развіваць навыкі публічных выступленняў і самапрэзентацыі, атрымліваць карысныя веды на варкшопах і сустрэчах з экспертамі. А 10 фіналістаў праекта, якіх абярэ журы, атрымаюць персанальных ментараў TEDx і з іх дапамогай будуць рыхтавацца да свайго вялікага публічнага выступлення на маштабнай маладзёжнай канферэнцыі TEDxYouth@Minsk.

Менавіта 10 фіналістаў выйдуць у славутае чырвонае кола TED і прэзентуюць свае ідэі перад вялікай аўдыторыяй. (Усе яны атрымаюць прызы — iPhone Xs.) Праект «Першыя» цалкам рэалізуецца на беларускай мове. Адна з мэт гэтай ініцыятывы — пашырэнне выкарыстання беларускай мовы і яе вядомасці ў сусветнай прасторы з дапамогай супольнасці TED.

Сацыяльна-адукацыйны праект «Першыя» рэалізуецца кампаніяй А1 пры падтрымцы арганізатараў канферэнцыі TEDxMinsk. У мінулым навучальным годзе кампанія А1 ужо рэалізоўвала падобны адукацыйны праект velcom YOUTH. Але праект «Першыя» абяцае стаць больш маштабным — у яго рамках запланаваныя мерапрыемствы не толькі ў Мінску, але і ў Гродне, Гомелі, Магілёве і Віцебску.

«Мы распачынаем праект «Першыя», каб стварыць для старшакласнікаў па ўсёй краіне дадатковыя магчымасці самаразвіцця па цікавых для іх тэмах. Мы верым, што прынцып «думай глабальна — дзейнічай лакальна» можа стаць штуршком для вялікіх змен», — падкрэслівае **начальнік аддзела карпаратыўных камунікацый А1 Мікалай БРЭДЗЕЛЕЎ.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Урад Эквадора пакінуў Кіта

Прэзідэнт Эквадора Ленін Марэна ўвёў у краіне надзвычайнае становішча і перавёў урад са сталіцы — Кіта — у горад Гуаякіль. Ён абвясціў пра гэта ў тэлезвароце да нацыі, перадае BBC News. Улады ўвялі каменданцкую гадзіну па ўсёй краіне ў раёнах, дзе размешчаны дзяржаўныя будынкі і стратэгічныя аб'екты. Такія меры прыняты ў сувязі з масавымі пратэстамі і беспарадкамі, у тым ліку з удзелам прадстаўнікоў карэннага насельніцтва. Паводле слоў прэзідэнта, рабаванне, вандалізм і гвалт сведчаць, што гэта вынік арганізаванай палітычнай дзейнасці, а не проста праява незадаволенасці грамадства эканамічным рашэннем уладаў. Пасля таго як урад адмяніў дзяржсубсідыі на паліва для насельніцтва, а цэны на яго выраслі з пачатку кастрычніка ў два разы, у краіне пачаліся пратэсты. Прадстаўнікі карэнных народаў і фермеры рушылі шматтысячным маршам на Кіта. Пратэстоўцы пачалі захопліваць паліцэйскіх і вайскоўцаў. Таксама ў краіне былі захопленыя пяць радовішчаў дзяржкампаніі Petroamazonas, і нафтавікі спынілі здабычу нафты. За апошнія некалькі дзесяцігоддзяў тры прэзідэнты Эквадора былі зрынуты ў выніку пратэстаў карэннага насельніцтва, нагадвае BBC.

## Тры чвэрці супербагацеяў жыве ў 10 краінах



Згодна з сёмым штогадовым даследаваннем World Ultra Wealth Report 2019, цяпер на планеце 265 490 чалавек, капітал якіх ацэньваецца не менш чым у 30 трыльёнаў долараў. Летась іх сумарны «кашалёк» упершыню за тры гады скараціўся. Праўда, нязначна — на 1,7 %. У 2018 годзе агульны капітал ацэньваўся ў 32,3 трыльёна долараў. Аўтары даследавання прагназуюць, што да 2023-га колькасць супербагацеяў павялічыцца да 353 550 чалавек, а іх сумарны бюджэт — да 43 трыльёнаў долараў. Звяртае на сябе ўвагу бурны рост колькасці звышзаможных жанчын. Цяпер на планеце такіх прадстаўніц слабага полу амаль 39 тысяч, ці 14,6 % ад агульнай колькасці нувaрышаў. Амаль тры чвэрці супербагацеяў (72 %) жыве ў 10 найбольш заможных краінах свету. Практычна кожны трэці (31 %) знаходзіцца ў Злучаных Штатах. Іх сумарны капітал — 9,84 трыльёна долараў. Гэта больш, чым ВУП Японіі і Германіі — трэцяй і чацвёртай эканомік планеты — разам узятых. На другім месцы Кітай. У Паднябеснай жыве 24 965 нуварышаў з сумарным капіталам 3,76 трыльёна долараў. Трэцяя ў рэйтынгу Японія з 17 855 звышбагацеямі і агульным даходам 1,67 трыльёна долараў. У топ-10 таксама Германія, Канада, Францыя, Вялікабрытанія, Італія і Швейцарыя.

## У Ізраілі знайшлі горад узростам пяць тысяч гадоў

У Ізраілі выяўленыя руіны найстаражэйшага і найбуйнейшага горада ў рэгіёне. Яны знаходзяцца за 50 кіламетраў ад Тэль-Авіва, і ім 5000 гадоў. У горадзе жыло каля 6 тысяч чалавек, яго ўжо называюць «Нью-Ёркам бронзавага веку». Там былі вуліцы, асобныя жылыя і камерцыйныя кварталы, храм і гарадскія сцены для абароны насельніцтва. Больш за тое, археолагі выявілі, што людзі жылі ў гэтым месцы нават 7000 гадоў таму. Ізраільскія археолагі кажуць, што гэта самая значная знаходка таго перыяду гісторыі. Горад, вядомы як Эн-Эсур, займае прыблізна 65 гектараў, што прыкладна ўдвая больш за памеры іншых вядомых паселішчаў той эпохі. Падчас раскопак знайшлі каля чатырох мільёнаў фрагментаў збаноў, інструменты, многія з якіх былі прывезены з Егіпта, а таксама надзвычай рэдкія статуэткі людзей і жывёл. Раскопкі на гэтым месцы працягваюцца ўжо два з паловай гады. Старажытны горад быў знойдзены выпадкова, падчас будаўніцтва новай шашы. Маршрут трасы быў перанесены, каб не пашкодзіць старажытнае паселішча.

# ЯК ВЫПЛАЦІЦЬ «НЯПРАВІЛЬНЫ» КРЭДЫТ?

## Не бярыце новых крэдытаў

Так: як бы парадаксальна гэтая фраза ні гучала, менавіта новыя пазыкі не даюць магчымасці расплаціцца па старых даўгах. Чалавек трапляе ў своеасаблівую фінансавую пастку: для аплаты запазычанасці ён вымушаны здымаць грошы з карткі, адкрываць дагаворы ў іншых банках. І выбрацца з гэтага замкнёнага кола сапраўды складана.

Менавіта таму важна пры падпісанні дагавора дакладна вызначыць для сябе, якую долю з агульнага даходу сям'і можна свабодна аддаваць у кошт аплаты крэдыту. Калі выйсці за гэтую мяжу, запазычанасць пачне нарастаць, нібы снежны ком. Вазьміце аркуш паперы і падрабязна распішыце свой доўг і перыяд, за які гэтую суму можна пагасіць, не звяртаючыся да новых крэдытаў.

## Павялічце штомесячны плацеж

На першы погляд, гэта зрабіць няпроста. Але паспрабуйце разлічыць, якую суму вы сэканоміце на аплаце працэнтаў, калі датэрмінова пагасіце абавязак. Калі ёсць магчымасць падключыць дадатковыя крыніцы для закрыцця доўгу — выкарыстоўвайце ўсё, што даступна.

Каб маштабна ацаніць пераплату па дамове, адразу глядзіце на гадавую суму. Бо ў асноўным менеджары ў банках пры афармленні крэдыту спецыяльна разбіваюць агульны доўг па месяцах. Гэта маркетынгавы ход, які дазваляе выклікаць прыхільнасць кліента. Пры гэтым сума крэдыту агучваецца адразу. Такім чынам у пазычальніка фарміруецца ўражанне, што пераплата па крэдыце нязначная, а значыць, можна не спяшацца.

Перш чым падлічыць суму для павелічэння штомесячнага плацяжу, звярніцеся да работніка банка. Неабходна высветліць, як адбываецца датэрміновае пагашэнне: ці няма схаваных камісій і штрафаў за такое пагашэнне, ці трэба пісаць заяву і ў які дзень месяца можна ажыццяўляць аплату. Усе гэтыя фактары могуць істотна паўплываць на фарміраванне канчатковай сумы. Часта ў дагаворы прысутнічаюць схаваныя плацяжы і санкцыі за датэрміновае поўнае або частковае пагашэнне доўгу. Банку нявыгадна, каб кліент раней закрываў крэдытны рахунак, таму многія ідуць на ўсялякія хітрыкі, каб не дапусціць гэтага.

## Знайсці дадатковую крыніцу даходу

У ідэале гэта можа быць пастаянная падпрацоўка. Але, можа, вам хопіць некалькіх дадатковых змен, часовага сезоннага заробку, разавага праекта або нават продажу непатрэбных рэчаў.

Гэтая дзейнасць не абавязкова павінна быць звязана з асноўным профілем і спецыялізацыяй. Увесну і ўлетку пастаянна патрабуюцца некваліфікаваныя работнікі для прыборкі дач, збору ўраджаю, падрэзкі кустоў. У зімовы час гэта можа быць рэпетытарства, прыборка кватэр, будаўнічыя і рамонтныя работы, пашыў адзення і фрыланс. Не варта ўпадаць у роспач і разглядаць гэты перыяд як цяжкую фінансавую кабалу. Выразна пазначце час, неабходны вам на закрыццё даўгоў.

І яшчэ: строга сачыце за тым, каб сродкі з дадатковага заробку расходаваліся выключна на аплату доўгу па крэдыце. Вызначце, наколькі вы зможаце скараціць гэты перыяд, калі будзеце ўносіць штомесяц акрамя абавязковага плацяжу дадатковыя 50 або 150 рублёў. Такія падлікі вельмі добра матывуюць і дапамагаюць сфарміраваць выразную стратэгію далейшых дзеянняў.



## Максімальна скараціце выдаткі

Важна ўсвядоміць, што без скарачэння выдаткаў выплаціць усе крэдыты не атрымаецца. Прааналізуйце ўсе свае даходы, выдаткі і пакіньце толькі самае неабходнае. Гэта павінны быць выдаткі на харчаванне, камунальныя плацяжы, транспарт і плата за вучобу. Тут трэба быць максімальна сумленным перад самім сабой і дакладна вызначыць, ад чаго часова можна адмовіцца на карысць хуткай выплаты крэдыту.

У гэты перыяд пазбягайце глабальных паходаў па крамах, анлайн-пакупак, абыходзіце бокам распродажы і складзіце план рацыянальнага, але эканомнага харчавання.

Сюды ж варта аднесці пазбаўленне ад дарагіх звычак (алкаголь, цыгарэты, абеды з супрацоўнікамі ў кавярнях, ды і пятнічныя вечары з сябрамі). Калі вы ўвесь час у даўгах і допускаеце пратэрмінoўкі па крэдытах, прааналізуйце сваё фінансавае становішча і выдаткі. Так вы зможаце рэальна ацаніць, наколькі тыя траты для вас важныя і ці можна іх пазбегнуць. Памятаеце, што гэта толькі часовыя жорсткія меры, якія дапамогуць вам вызваліцца ад даўгоў.

## Метад снежнага камяка

Такі спосаб актуальны для тых, у каго адкрыта адразу некалькі дагавораў. Гэта могуць быць спажывецкія крэдыты, карты растэрміноўкі і іншае.

Складзіце спіс усіх незакрытых даўгоў і вызначыце чарговасць іх пагашэння. Адразу старайцеся пагасіць усе дробныя сумы, каб максімальна скараціць колькасць дагавораў. Па-першае, гэта дасць псіхалагічную палёгку і дазволіць убачыць выхад з цяжкай фінансавай сітуацыі. Па-другое, дапаможа сэканоміць. Працэнты па дробных крэдытах, як правіла, самыя высокія. Праз невялікую суму пазычальнік не звяртае на гэта ўвагі і ў выніку вяртае банку доўг амаль у падвойным памеры. Пасля закрыцця ўсіх дробных крэдытаў можна пераходзіць да пагашэння буйных сум.

## Рэфінансаванне доўгу

Гэта фінансавы інструмент, які дае магчымасць атрымаць новую пазыку для пагашэння старой. Зразумела, такі метад цалкам ад выплаты крэдыту не вызваліць. Але ён дазволіць пазбегнуць маёмаснай і фінансавай адказнасці, пазбавіцца ад выплаты штрафной пені і заключыць дамову на больш выгадных для сябе ўмовах.

Калі людзі звяртаюцца па рэфінансаванне і чаму гэта выгадна? Гэта, па сутнасці, адкрыццё новага крэдыту, што прадугледжвае заключэнне іншага дагавора на іншых умовах.

Сёння многія банкі прапануюць такія праграмы, каб дапамагчы пазычальнікам вырашыць фінансавыя цяжкасці і прыцягнуць новых кліентаў. Даючы паслугу рэфінансавання доўгу, банк не застаецца ў пройгрышы. Для банка значна больш выгадна павялічыць тэрмін крэдытавання і разбіць плацяжы на больш дробныя сумы, чым атрымаць пратэрміноўкі. Рэфінансаванне вашых даўгоў іншым банкам таксама знаходзіць сваё тлумачэнне. Кампанія такім чынам атрымлівае новага кліента, які будзе выплачваць камісію за паслугу крэдытавання ўжо ёй.

У кожнага банка існуе свой парадак праверкі і адбору кліентаў для рэфінансавання. Напрыклад, калі пазычальнік прапусціў усяго адзін-два плацяжы, то ён трапляе ў адну катэгорыю фінансавых рызык, калі ж сістэматычна не выплачвае крэдыт — у іншую.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### У тэму

## Як 100 рублёў доўгу ператварыліся ў суму, большую ў 50 разоў

Пракуратура Гродзенскай вобласці апратэставала рашэнне суда па спагнанні доўгу на карысць мікрафінансавай арганізацыі. На думку нагляднага органа, устаноўленая ў такіх дагаворах стаўка працэнтаў за карыстанне чужымі грашовымі сродкамі не адпавядае прынцыпу добрасумленнасці і разумнасці ўдзельнікаў грамадзянскіх праваадносін.

У якасці прыкладу пракуратура прыводзіць гісторыю з адным акцыянерным таварыствам, якое звярнулася з заявай у суд у сувязі з невяртаннем грамадзянінам С. усёй сумы пазыковых грашовых сродкаў. Таварыства прасіла спагнаць з адказчыка 100 рублёў пазыкі, працэнты за карыстанне пазыкай у суме 20 рублёў, працэнты за карыстанне чужымі грашовымі сродкамі ў суме 4880 рублёў, аплачаную дзяржпошліну ў памеры 250 рублёў, а ўсяго — 5250 рублёў.

Завочным рашэннем суда Кастрычніцкага раёна горада Гродна іскавыя патрабаванні арганізацыі задаволены ў поўным аб'ёме. Вывучыўшы грамадзянскую справу ў парадку нагляду, пракуратура Гродзенскай вобласці ўстанавіла, што адказчык спыніў выкананне абавязацельстваў па дагавору ў 2014 годзе, а заяву фірма прад'явіла ў суд толькі праз чатыры гады. Сума працэнтаў перавысіла суму пазыкі амаль у 49 разоў.

З мэтай аднаўлення парушаных правоў пазычальніка пракуратура Гродзенскай вобласці вынесла пратэст на судовае рашэнне. Пры новым разглядзе справы на карысць таварыства спагнаная агульная запазычанасць па дагавора пазыкі ў памеры 1000 рублёў, судовыя выдаткі па аплаце дзяржпошліны ў памеры 25 рублёў, а ўсяго — 1025 рублёў. Рашэнне суда бакі не абскардзілі, яно ўступіла ў законную сілу.

### Ну і ну!

## ЗНЕШНАСЦЬ — НА ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ РУБЛЁЎ

**Мінчанін скарыстаўся падабенствам з калегам і заваладаў больш чым 2000 рублёў.**

Як паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама, званок з банка аб наяўнасці запазычанасці па крэдыце прымусіў пахвалявацца 24-гадовага мінчаніна. Маладому чалавеку паведамілі, што на яго імя аформлены крэдыты на куплю бытавой тэхнікі. Паколькі той гэтага не рабіў, то звярнуўся па дапамогу да праваахоўнікаў.

Аператыўнікі вывучылі прадстаўленыя банкам дакументы, правялі праверку і ўстанавілі, што да афармлення крэдытаў датычны 23-гадовы калега заяўніка. Знайшоўшы ў рэчах апошняга пашпарт, ён адправіўся ў найбліжэйшую краму бытавой тэхнікі, дзе аформіў на чужое імя крэдыт на куплю бытавой тэхнікі. Падазронняў у супрацоўнікаў банка хлопец не выклікаў, паколькі меў знешняе падабенства з чалавекам на фатаграфіі ў пашпарце. Набыўшы тэхніку, ён перапрадаў яе пры дапамозе інтэрнэту.

## ЗА РУЛЁМ — МАЛОЕ ДЗІЦЯ...

**Жыхар Мінскага раёна перадаў кіраванне аўтамабілем свайму 9-гадоваму сыну. Увагу інспектараў ДПС ДАІ УУС Мінаблвыканкама, што неслі службу ў вёсцы Валяр'янава, прыцягнуў аўтамабіль «Фольксваген», які кіравала... дзіця.**

У ходзе разбору было ўстаноўлена, што бацька 9-гадовага хлопчыка вырашыў навучыць таго ездзіць на машыне і перадаў руль непаўналетняму. Сам бацька ўбачыць знаходзіўся на пярэднім пасажырскім сядзенні. У дачыненні да мужчыны складзены адміністрацыйны пратакол за перадачу права кіравання асобе, якая не мае права кіравання. Таксама матэрыялы перададзены для далейшага разгляду ў інспекцыю па справах непаўналетніх.

Дзяржаўтаінспекцыя Мінскай вобласці нагадвае, што, згодна з заканадаўствам, навучанне ў аўташколе на катэгорыю «В» могуць праходзіць грамадзяне, якія дасягнулі 16-гадовага ўзросту. Да здачы экзаменаў у ДАІ допускаюцца асобы, якія дасягнулі 18 гадоў (катэгорыя «А» — уключна).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: Государственное предприятие «МОЛОДЕЧНОСТРОЙМАТЕРИАЛЫ» (УНП 690608054) в лице антикризисного управляющего ООО «ПрофДМ», тел. + 375 (17) 395-81-34.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **11 ноября 2019 г.** с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Кран башенный | 14 100,00 |
| 2 | Станок строгальный 4-сторонний | 5 200,00 |
| 3 | Пилорама Р63 4 Б | 5 000,00 |
| 4 | Станок 4-сторонний | 10 000,00 |
| 5 | Станок круглопильн. многоп. | 4 600,00 |
| 6 | Станок угло-зачист. СА-606 | 2 700,00 |
| 7 | Машина двухгол. DK 502 | 5 200,00 |
| 8 | Стол для раскроя стекла | 21 000,00 |
| 9 | Пила для резки дистанц. проф. | 3 500,00 |
| 10 | Экструдер гидравлический | 32 800,00 |
| 11 | Оборудование для засыпки сита | 3 100,00 |
| 12 | Кондиционер для охлаждения | 5 700,00 |
| 13 | Бутилэкструдер 7,5 кг | 15 700,00 |
| 14 | Авт. линия для производства стеклопакетов | 59 800,00 |
| 15 | Электропневматический стол | 4 400,00 |
| 16 | Установка компрессорная ВК10Е | 5 300,00 |
| 17 | Двухголовочная пила | 8 000,00 |
| 18 | Пресс ZPX 14378 | 3 000,00 |

Местонахождение: Минская обл., г. Молодечно, ул. Сухая, 73, контактный тел. для осмотра 80296055342.

**Для участия в торгах необходимо в срок по 08.11.2019 г. до 17.00:** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY;** 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, заключить договор купли-продажи не позднее 10 рабочих дней со дня подписания протокола по результатам торгов. Срок оплаты предмета торгов: по условиям договора купли-продажи, но не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов.



## О реализации на аукционе имущества УП «ТРАКТРАНССЕРВИС».

Организатор: ИП О. Н. Домакур (8029-6717173). Продавец – УП «ТРАКТРАНССЕРВИС». 15.11.2019 в 10.20 по адресу: Минск, Академическая, 15. Лоты: 1. LAND-ROVER RANGE-ROVER г/н 9396НА-7 – 25 440 руб; 2. VOLKSWAGEN TOUAREG г/н 9617ОК-7 – 6081,5 руб. Нач. цена – выше. Победителем признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Задаток возвращается в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола. Результаты оглашаются в день проведения торгов. Если торги признаны несостоявшимися (заявление подано одним участником), предмет продается по цене, увеличенной на 5 %. Шаг торгов 5 %. Заявки принимаются до 12.11.2019. Задаток перечисляется (10 % от нач. цены) на счет BY40UNBS30120694300070000933 (ЗАО «БСБ Банк»). Желающие подают заявление на участие в торгах с приложением документов. Возможно снятие имущества с торгов не позднее чем за пять дней до их проведения. Затраты возмещаются победителем (подробно – на сайте bankrot.gov.by) УНП 190024522

Сямейная газета
Выпуск № 14 (132)

# ДАВАЙЦЕ ЎСКЛІКАЦЬ!

*Некалі навіны абмяркоўвалі на лаўках пад пад'ездамі, у чэргах ды ў транспарце — цяпер у сацыяльных сетках і на форумах. Вось чарговы раз Байнэт гудзе вакол добрага ўчынку курсанта Універсітэта грамадзянскай абароны МНС з Гродна: на сталічным аўтобусным прыпынку ён даў цёплую куртку замерзлай дзяўчынцы, а яе мама падзялілася гісторыяй у сеціве. Рэпосты, лайкі, увага СМІ — у лічаныя дні хлопца адшукалі і, здаецца, нават збянтэжылі такой удзячнай увагай. «Не лічу, што зрабіў штосьці надзвычайнае, — пачуў, што дзяўчынка замярзае, прапанаваў куртку. Хіба вы не зрабілі б гэтак жа?» — сказаў журналістам хлопец.*

*Альбо ўзяць іншую нядаўнюю гісторыю, што мела гучны рэзананс: у заўсёдных «пошуках вінаватых», якія традыцыйна разгортваюцца ў нас пасля кожнага адбору на дзіцячае ці дарослае «Еўрабачанне», адзін з грамадскіх актывістаў публічна абвінаваціў у ангажаванасці аднаго з суддзяў. А калі досыць хутка высветлілася, што гэтыя абвінавачанні не маюць пад сабой падставы, публічна ж папрасіў прабачэння, і канфлікт быў вырашаны. Што аб'ядноўвае гэтыя два выпадкі? Рэакцыя большасці інтэрнэт-карыстальнікаў на нармальныя паводзіны чалавека ў цывілізаваным грамадстве. Гэткае падкрэсленае здзіўленне і захапленне, маўляў, хіба ў наш час так бывае — узяў і паклапаціўся пра дзіця, не чакаючы падзякі, узяў і прызнаў, што не меў рацыі, не чакаючы наступстваў?*

*Адчуванне, прызнацца, узнікае двайстае. Альбо нешта вельмі сур'ёзна паламалася ў нас «у кансерваторыі», і сёння нармальныя ўчынкі становяцца для грамадскасці ўзрушэннем і інфармацыйнай нагодай. Альбо мы ўсе, стаміўшыся нарэшце ад агрэсіі, узаемнай непавагі і нявыхаванасці, пачынаем цаніць простыя, базавыя рэчы — шчырасць, бескарыслівасць, адказнасць за свае словы... Тады сапраўды не лішне будзе акцэнтаваць увагу на кожным такім выпадку, пакуль, рана ці позна, не пойдзе ланцуговая рэакцыя ўзаемадапамогі, ветлівасці і ўдзячнасці.*

*Згадайце, што абурала булгакаўскага персанажа Шарыкава ў паводзінах дамачадцаў прафесара Праабражэнскага? «Вось усё ў вас як на парадзе: сурвэтку — туды, гальштук — сюды, ды «прабачце», ды «калі ласка-мерсі». А так, каб па-сапраўднаму, — гэта не». — «А як гэта «па-сапраўднаму», дазвольце спытацца?» Шарыкаў нічога на гэта не адказаў Філіпу Філіпавічу, а толькі выпіў кілішак. Ну а чым гісторыя скончылася, пільныя чытачы і гледачы таксама помняць...*

*Дык вось, каб колькасць Шарыкавых сярод нас не набрала крытычную масу, прапаную прыслухацца да класіка іншай эпохі, бясконца мудрага і добрага Булата Акуджавы. Давайце захапляцца адно адным, хваліць і гаварыць кампліменты — нават за дробязі кшталту прытрыманых у метро дзвярэй ці падказаную ў незнаёмым месцы дарогу. І не толькі ў сацыяльных сетках, але і наўпрост у жывых стасунках. Давайце пісаць не толькі скаргі, але і падзякі, заўважаць не толькі чорныя, але і белыя фарбы. Высакароднасць на любым узроўні вартая таго, каб быць заўважанай, — а добрае слова нават кошцы прыемна, не тое што чалавеку.*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Азбука прафесій

# МАЯ МАМА — БАЛЕРЫНА!



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

**ПОМНІЦЕ радкі з верша Сяргея Міхалкова: «Мама — лётчик? Что ж такого! Мамы всякие нужны, мамы всякие важны». У малодшых класах і сёння школьнікі часта пішуць сачыненні пра прафесіі сваіх бацькоў, да Дня маці робяць кранальныя партрэтныя галерэі кшталту «Мая мама — урач»... А калі не ў школе і не на адзнаку — ці многае могуць расказаць? Дазнацца пра гэта мы вырашылі ў саміх дзяцей, а таксама ў іх мам і тат.**

**«Сямейная газета» распачынае новую рубрыку «Азбука прафесій», якая, спадзяёмся, раскрые для чытачоў сакрэты многіх на першы погляд звычайных прафесій. А героямі першага выпуску сталі салістка балетнай трупы Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Таццяна УЛАСЕНЬ і яе дачка, 9-гадовая Анюта, — як ні дзіўна, таксама балерына.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

Напярэдадні свята

# ФЕСТЫВАЛЬ ШЧАСЦЯ І ЛЮБОВІ

**12 кастрычніка фінішуе чацвёрты рэспубліканскі конкурс «Сям'я года», які праводзіцца ў Беларусі з мэтай умацавання ролі і прэстыжу сям'і ў сучасным грамадстве, выхавання дзяцей і моладзі ў рэчышчы традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, арыентаваных на стабільнасць стасункаў, адказнае бацькоўства, здаровы лад жыцця, захаванне пераемнасці пакаленняў, узаемаразуменне і ўзаемападтрымку.**

**У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь падкрэсліваюць: «Сям'я года» — не толькі сацыяльна значнае мерапрыемства, зладжанае ў адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь», але перадусім вялікае свята. Яго ўдзельнікі на ўласным прыкладзе пацвярджаюць, што моцная, дружная, шчаслівая сям'я — тая найвялікшая каштоўнасць, з якой бярэ пачатак грамадства, тая крыніца, якая сілкуе і падтрымлівае кожнага з нас усё жыццё».**

**Незалежна ад таго, хто атрымае сёлета дыплом I ступені і званне «Сям'я года — 2019», усе сямёра фіналістаў у поўным сэнсе ўжо трыумфатары: яны сталі найлепшымі сем'ямі ў сваіх рэгіёнах, а галоўнае — яны з'яўляюцца добрымі сябрамі, апорай і падтрымкай адно для аднаго. І, паверце, у кожнага з іх ёсць карысны досвед, варты пераймання: як спраўляцца з канфліктамі і захоўваць лад і згоду, як адкрываць і падтрымліваць таленты сваіх дзяцей, як зрабіць актыўнае баўленне часу добрай звычкай, як навучыцца слухаць і чуць адзін аднаго... Уласна, пра ўсё гэта лепш раскажуць самі героі ў фінале рэспубліканскага конкурсу, а напярэдадні карэспандэнты «СГ» падрыхтавалі невялікую партрэтную галерэю сем'яў-удзельніц. Прыемнага знаёмства!**

*(Працяг тэмы на 3–5-й стар. «СГ».)*

## Сацыяльная кансультацыя

# Закон — на баку маці

### Калі жанчыны з дзецьмі могуць працаваць няпоўны рабочы дзень або тыдзень?

**Спецыялісты Мінпрацы і сацыяльнай абароны адказваюць на чарговыя пытанні чытачоў.**

**?** ***Работніца, якая мае дзіця ва ўзросце 12 гадоў, звярнулася да наймальніка з просьбай аб устанаўленні ёй няпоўнага рабочага часу. Наймальнік адмовіў у просьбе, матывуючы сваю адмову вытворчай неабходнасцю прысутнасці работніцы поўны рабочы дзень. Ці правамерна зрабіў наймальнік?***

— У адпаведнасці з артыкулам 289 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь наймальнік абавязаны ўстанаўліваць няпоўны рабочы дзень або няпоўны рабочы тыдзень па просьбе жанчыны, якая мае дзіця ва ўзросце да 14 гадоў (у тым ліку дзіця, якое знаходзіцца пад яе апекай).

Названая норма з'яўляецца абавязковай для выканання наймальнікам.

Акрамя названай катэгорыі работнікаў, наймальнік абавязаны ўстанаўліваць няпоўны рабочы дзень або няпоўны рабочы тыдзень асобам з інваліднасцю ў адпаведнасці з іх індывідуальнымі праграмамі рэабілітацыі; работнікам, якія працуюць на ўмовах сумяшчальніцтва пры прыёме на работу; іншым катэгорыям работнікаў, прадугледжаным калектыўным дагаворам, пагадненнем.

Пералічаным работнікам наймальнік абавязаны ўстанаўліваць няпоўны рабочы час, нават калі гэта не адпавядае вытворчым інтарэсам наймальніка.

Пералік прыведзеных у артыкуле 289 Працоўнага кодэкса катэгорый работнікаў, якім наймальнік абавязаны ўстанаўліваць няпоўны рабочы дзень або няпоўны рабочы тыдзень, не з'яўляецца вычарпальным. Акрамя названых, калектыўным дагаворам, пагадненнем могуць быць прадугледжаны іншыя катэгорыі работнікаў. Напрыклад, у калектыўным дагаворы можа быць замацавана норма аб устанаўленні няпоўнага рабочага часу жанчынам, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, работнікам, якія сумяшчаюць працу з навучаннем, і г. д.

* * *

**?** ***З'яўляюся шматдзетнай маці, у сям'і трое дзяцей да 16 гадоў. Графік работы на прадпрыемстве зменны — у тры змены: з 0 да 8, з 8 да 16 і з 16 да 24 гадзін. Вытворчасць бесперапынная, працую шэсць дзён запар, затым два выхадныя і г. д. У сувязі з гэтым абраны дадатковы вольны ад работы дзень — панядзелак — перыядычна прыпадае на выхадныя дні і знікае. Ці можна перанесці яго на іншы дзень тыдня? (Н. Г.)***

— У якасці дадатковага вольнага дня работніку даецца выбраны ім па ўзгадненні з наймальнікам дзень тыдня — па яго пісьмовай заяве. У заяве работнік указвае абраны ім дзень тыдня і перыяд (перыяды) каляндарнага года, калі ён жадае скарыстацца правам на гэты вольны дзень.

Даванне такога дня афармляецца загадам (распараджэннем) наймальніка, які выдаецца на працягу трох рабочых дзён з дня падачы заявы на любы перыяд (любыя перыяды) каляндарнага года, вызначаны (вызначаныя) работнікам па ўзгадненні з наймальнікам. У загадзе (распараджэнні) указваецца абраны вольны дзень тыдня і перыяд (перыяды), на які (якія) ён даецца.

Падсумоўванне і перанос вольных дзён у тыдзень у мэтах далейшага давання іх у сукупнасці не дапускаецца, але абмежаванняў наконт перыядычнасці напісання заявы аб даванні вольнага дня ў тыдзень і колькасці гэтых заяў на працягу каляндарнага года заканадаўствам не ўстаноўлена. У сувязі з гэтым вы маеце магчымасць напісання заявы пры складанні графіка работы. Напрыклад, у заяве можна ўказаць адзін з тыдняў месяца адзін вольны дзень, у іншы тыдзень — іншы вольны дзень.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

# МАЯ МАМА — БАЛЕРЫНА!

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)**



***— Аня, ці ведаеш ты, як мама стала артысткай балета?***

**Аня:** Не.

**Тацццяна:** Калі я была маленькая, мама вадзіла мяне на мастацкую гімнастыку, і там трэнер рэкамендавала паспрабаваць паступіць у харэаграфічнае вучылішча. Я прайшла ўступныя іспыты, але мама вельмі доўга раздумвала, ці варта мне быць балерынай, і ўсё не падавала дакументы, а я нервавалася і прасіла: «Мама, ну вязі хутчэй, бо мяне ж не возьмуць!» Па шчырасці, танцаваць мне заўжды падабалася — і ўжо калі паступала, то зразумела, што хачу, мару стаць балерынай.

***— А дачка сама пацягнулася следам ці мама ўгаварыла?***

**А.:** Я сама хацела! Мне падабаецца танцаваць на сцэне, у прыгожых касцюмах. І калі мама танцуе ў спектаклях — таксама, я з самага дзяцінства бачу яе пастаноўкі. Асабліва люблю «Спячую прыгажуню», мама там вельмі добра танцуе партыю Феі Карабос.

**Т.:** Парадокс у тым, што гэта злая фея — але дзіця так бачыць.

***— Што самае складанае ў гэтай прафесіі?***

**А.:** Часам не падабаюцца некаторыя танцы, якія ставяць. І на шпагаце сядзець не люблю.

**Т.:** Самае складанае — калі ты рыхтуеш нейкую партыю, не блізкую табе, але яе трэба «зрабіць». Што я маю на ўвазе: бывае, персанаж зусім на цябе не падобны, а трэба ўвасобіць яго так, каб глядач паверыў, убачыў не штучную наігранасць, не Таню Уласень у гэтай ролі, а самога персанажа.

***— Тады што самае прыемнае?***

**А.:** Калі танцуеш не ў масе, а адна, і ўся ўвага скіравана на цябе. Мая любімая партыя — з балета «Павільён Арміды» — А ў будучыні мару станцаваць Чорнага лебедзя.

**Т.:** Калі, станцаваўшы спектакль, ты застаўся ім задаволены. Зразумела, заўжды ёсць над чым папрацаваць і няма межаў дасканаласці, але калі пастаўленыя перад сабой задачы збольшага выконваеш, то на наступны спектакль ставіш новыя задачы, вышэйшыя планкі, і тады ў артыста адбываецца рост. І, безумоўна, важная як прафесійная ацэнка рэпетытара, з якім ты працаваў над спектаклем, наколькі чыста і тэхнічна былі выкананы тыя ці іншыя пазіцыі, так і рэакцыя публікі, бо ўсё, што мы робім, па вялікім рахунку робіцца для гледача — і калі ён суперажывае, верыць, гэта сапраўды дарагога каштуе... Вось калі пайду са сцэны, то больш часу і сіл аддам педагогіцы — я выкладаю ў маленькіх дзетак, якіх вучу танцам, і ў будучыні буду танцаваць праз сваіх вучняў. Калі ты бачыш, што ў іх атрымліваецца, — гэта вельмі ўсцешвае.

***— З дачкой вы мама ці педагог?***

**Т.:** У нас быў такі вопыт, калі я рэпеціравала з Аняй, — гэта і для мяне, і для яе стала выпрабаваннем, бо ўласныя дзеці не ўспрымаюць цябе як педагога, могуць і раскапрызіцца, і адмовіцца нешта рабіць... Цяпер Аня пасталела і ўжо інакш успрымае заўвагі, не крыўдзіцца. Я, у сваю чаргу, стараюся тлумачыць: «Ты малайчынка, але можна зрабіць лепш — вось тут дацягнуць ступню, тут калена». У нашай прафесіі заўжды ёсць куды расці, але трэба быць вельмі асцярожным, бо для дзяцей важная ацэнка і пахвала блізкіх людзей, і рэзкім словам можна адбіць усю ахвоту займацца.

**А.:** Так, з мамай рэпеціраваць складана, яна строгая.

***— Балерына — прэстыжная прафесія?***

**А.:** А што такое «прэстыжная»? Калі пра заробак, то ў нас балерыны зарабляюць не вельмі многа, але ёсць краіны, дзе добра плацяць. Таму я хачу стаць балерынай і паехаць у розныя краіны свету — але яшчэ не ведаю дакладна, куды.

**Т.:** Што тут скажаш — пагаджуся з Аней, у нашай краіне балерына — не надта прыбытковая прафесія. Асабіста мне хапае грошай, каб забяспечваць сваіх дзяцей, але заўжды ёсць да чаго імкнуцца. Наздарма існуе выраз: грошай ніколі не бывае многа, і багатыя па маіх мерках людзі, пэўна, лічаць, што зарабляюць недастаткова. Так, хацелася б большай матэрыяльнай аддачы, бо артыст балета — штучны тавар, атрымаць гэту прафесію можа далёка не кожны, мы вучымся дзевяць гадоў, а сцэнічны век даволі кароткі... З другога боку, на мой погляд, артыст — гэта не пра грошы. Наогул, не толькі артысту, а кожнаму чалавеку трэба займацца тым, што прыносіць яму радасць, тады ад гэтай працы насамрэч будзе плён. А хадзіць на работу дзеля грошай і ціха ненавідзець тое, чым займаешся, — навошта?

***— Калі дачка перадумае ісці па вашым шляху...***

**Т.:** Я ў любым выпадку падтрымаю яе выбар і буду дапамагаць, наколькі гэта ў маіх сілах. Яна сама выбрала заняткі балетам, і я, ведаючы цяжкасці гэтай прафесіі, заўжды казала: «Аня, ты павінна разумець, што балерына — гэта не толькі дзяўчына на сцэне ў прыгожым уборы, а паўсядзённая цяжкая праца, і нават калі табе нешта баліць, твая задача — несці радасць людзям, а свае асабістыя перажыванні пакінуць за кулісамі».

***— Апішыце балерыну літаральна двума-трыма словамі — якая яна?***

**А.:** Худая, прыгожая... *(у задуменні глядзіць на маму).* Не ведаю нават, што дадаць.

**Т.:** Працавітая, зграбная... На гэтым, напэўна, спынюся.

***— Што яшчэ, на ваш погляд, варта ведаць бацькам, дзеці якіх мараць стаць артыстамі балета?***

**Т.:** Аддаючы дзіця ў харэаграфічнае вучылішча, трэба разумець, што прафесія патрабуе сур'ёзнага стаўлення і што будуць вялікія нагрузкі. Неабходна дапамагаць спраўляцца з імі: наладзіць правільнае харчаванне, рэжым адпачынку — абавязкова, бо па-іншаму ні мышцы, ні нервы не аднаўляюцца. Балет — прыгожае мастацтва, калі ты сядзіш у глядацкай зале, але адваротны бок медаля — праца, праца, праца. І працаваць неабходна ўсё жыццё.



**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

# СЮРПРЫЗ ДА ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

**У сям'і Кулаковых з Віцебска мяркуюць, што сакрэт шчасця — у колькасці дзяцей. Тут тры дачкі: школьніцы Ксюша і Кіра і маленькая Саша. Да сваіх сонейкаў (старэйшая і малодшая дочкі рыжыя) вяртаецца з работы тата — энергетык Дзяніс. А мама Марына паспявае працаваць на страхавым прадпрыемстве і лічыць, што для дачок-падлеткаў удзел у конкурсе — яскравая прыгода і магчымасць вылучыцца сярод аднагодкаў.**

Усе рашэнні ў сям'і прымаюцца сумесна, аднак асаблівую важнасць мае бацькава меркаванне, кажа маці сямейства:

— З цягам часу з'яўляецца поўная жаночая мудрасць, калі разумееш, што лепш, напэўна, пагадзіцца, бо я гляджу на дзяўчынак з жаночай пазіцыі, а патрэбны і мужчынскі погляд.

— Вядома, мяне дзяўчынкі слухаюцца, я для іх аўтарытэт. Аднак і мама карыстаецца той жа павагай, — дадае Дзяніс Генадзевіч.

Яшчэ да вяселля ён скарыў Марыну стаўленнем да чужых дзяцей, прызнаецца яна:

— Усе суседскія хлопцы званілі ў дзверы і пыталіся: «А Дзяніс выйдзе, будзе з намі ў футбол гуляць?» Тое, што ў яго адны дзяўчынкі, — гэта найвышэйшае шчасце, і ён зробіць для іх абсалютна ўсё. Пры гэтым будзе прытрымлівацца пэўных крытэрыяў строгасці і мужчынскага бачання.

— Я прыходжу дадому як у кветнік і акунаюся ў самыя цёплыя абдымкі сваіх рыжыкаў. Яны заўжды мне нешта смачнае прыгатуюць, спытаюць, як справы на рабоце, — пацвярджае бацька сямейства. — Я столькі святла атрымліваю ад гэтых косак і спаднічак.

Марына запэўнівае, што яны — самая звычайная сям'я, далёкая ад медыйнасці, якая ніколі не імкнулася выдзяляцца. Проста так склалася, што дзяўчынкі ўдзельнічалі ў конкурсах у школе. Запрасілі далучыцца да конкурсу на званне лепшай мамы і яе — давялося рыхтавацца.

— Пасля гэтага школьная адміністрацыя вырашыла, што мы актыўная сям'я, і запрасіла да ўдзелу ў конкурсе на найлепшую сям'ю, — смяецца жанчына. — Не ўсё атрымлівалася так, як хацелася б, канешне. Затое цяпер больш нагод сабрацца разам, чаго даўно не рабілі. А Ксюша падчас фіналу наўпрост на сцэне адзначыць свой 14-ы дзень нараджэння. І мы ўжо гэта абыгралі ў выступленні, так што яе чакае сюрпрыз.



Калі ў сям'і ёсць павага і каханне, то ўсё становіцца на свае месцы, перакананы Кулаковы: «Бывае рознае ў стасунках, аднак галоўнае — памятаць, што яны яшчэ дзеці, а мы ўжо бацькі, таму трэба неяк знаходзіць кампрамісы ў сітуацыях, якія нам першапачаткова здаваліся бязвыхаднымі».

# ТРЫМА РУКАМІ «ЗА»



**— Мая пазіцыя — рух, дынаміка, актыўнасць, творчасць, — заяўляе Наталля КОЦІК, настаўніца пачатковых класаў дзяржаўнай установы адукацыі «Вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад — пачатковая школа № 10 горада Брэста».**

**Брастаўчанка — пераможца абласнога конкурса «Выхоўваем грамадзяніна Беларусі», узнагароджана дыпломам II ступені ўпраўлення адукацыі аблвыканкама, шматлікімі граматамі і падзякамі. Яна любіць вязаць, ствараць прыгожыя рэчы з цеста, бісеру, паетак і нават... газетных трубачак! Ну як з такой творчай мамай не перамагчы! А калі сям'я Коцік выйграла Брэсцкі абласны этап конкурсу «Сям'я года», і маці ў сваіх дзяцей запыталася: «Далей будзем удзельнічаць?» — то ўбачыла тры ўзнятыя ўгору рукі.**

— Мы з мужам пераглянуліся і былі вымушаны пагадзіцца. Рухавіком у конкурсе была я, але атрымала падтрымку нашых дзетак, і гэта вельмі прыемна. І няхай яны ў нас не такія вялікія — 3, 6, а старэйшаму 12 гадоў, — мы верым, што яны зробяць усё магчымае, каб перамагчы, — дзеліцца Наталля Віктараўна. Можна не сумнявацца, што на конкурсе брэсцкая сям'я выступіць зладжанай камандай.

— Як такога галоўнага ў сям'і няма, абавязкі даўно падзелены, і кожны адказвае за свой фронт работ. Напрыклад, дзеці сочаць за парадкам у пакоях. Бытавыя абавязкі на кухні размеркаваны паміж усімі: можа дапамагаць і муж, і маленькая дачушка. Самы любімы занятак у маёй Машы — работа з цестам. Даеш ёй кавалачак — і яна лепіць кветачку, таму ў нас беляшы з кветкамі, — раскрывае хатнія сакрэты Наталля Віктараўна. Наогул у сям'і рабіць уласную выпечку ўжо ўвайшло ў традыцыю. Дзеці вельмі любяць піцу, пончыкі, беляшы, і такія ласункі заўсёды бываюць на стале.

Бацька сямейства Сяргей Георгіевіч (менеджар па продажах, захапляецца скаладромам і праграмаваннем) заўсёды гатовы прыйсці жонцы на дапамогу, адвесці дзяцей на трэніроўкі і рэпетыцыі. Шасцігадовы Андрэйка займаецца ў секцыі па плаванні, гуляе ў шашкі, захапляецца мадэляваннем. А старэйшы Валодзя ходзіць на скачкі на батуце, у спартыўную секцыю бадмінтона, піша вершы, праграмуе, цікавіцца аматарскай астраноміяй і добра разбіраецца ў геаграфіі.

Сакрэт шчаслівай сям'і — найперш цярпенне, узаемная павага, упэўнены Коцікі. «Шчасце ў сям'і можа з'явіцца толькі тады, калі яно свеціцца ўнутры чалавека, у кожным з нас», — кажа Наталля Віктараўна.

# КАНФЛІКТЫ РАЗРУЛЬВАЕМ АДРАЗУ

**У сям'і Мікалаевых з Магілёва — фіналістаў ад вобласці — пяцёра дзяцей. Трое з іх ужо амаль дарослыя. Андрэю і Алесі па 20 гадоў, Уладзіславу 17. Яны вучацца ў каледжах і працуюць, аднак жыць асобна ад бацькоў не спяшаюцца. Аляксандра ходзіць у школу, а самая малодшая, Станіслава, — у дзіцячы садок. Тата Сяргей працуе на камбінаце «Магілёўхімвалакно», мама Алена — памочнік выхавацеля ў садку.**

У гэтай сям'і заведзена прымаць рашэнні з улікам інтарэсаў кожнага. Сямейныя нарады ў Мікалаевых адбываюцца рэгулярна. Па гаспадарцы падзелу абавязкаў таксама няма — дапамагае той, хто вольны ў пэўны момант, і ўгаворваць на гэта нікога не трэба.

Удзельнічаць у фінале рэспубліканскага спаборніцтва за званне найлепшай сям'і таксама будуць усе разам — каб і сябе паказаць, і на іншых паглядзець. Прычым прапановы дзяцей пры падрыхтоўцы таксама ўлічваюцца.

— Я пісала сцэнарый, пасля чытала яго сям'і, мы ўсе разам абмяркоўвалі, кожны выказваў сваё бачанне, нейкія моманты перараблівалі, — расказвае Алена Аляксандраўна. — Мы ўсе людзі крыху творчыя, таму прывыклі да такога вар'яцкага рытму. Пастаянна нейкія канцэрты, рэпетыцыі, выступленні, так што падобныя клопаты не ў навінку.

Кожны член сям'і пароўну разбірае сабе і словы, і песні, і ролі. Калі Мікалаевы сказалі рэжысёру, што ім трэба сем мікрафонаў для выступлення, ён здзівіўся і спытаў: «А што, у вас усе гаворачыя?» Вядома ж, усе, нават Станіслава будзе спяваць і ўдзельнічаць у іншых пастаноўках, смяецца мама Алена:

— Удзелам у конкурсе мы самі сабе даказалі, што мы сям'я, што мы дружныя, згуртаваныя і можам нешта разам. Пасля конкурсу будзем адпачываць, бо ўдзельнічаць у спаборніцтвах такога ўзроўню ўжо і адказна, і цяжкавата.

Як і ва ўсіх сем'ях, у Мікалаевых, вядома, бываюць і спрэчкі, і канфлікты, але ж кожны раз сітуацыю стараюцца «разруліць» адразу, не замоўчваць у сабе крыўды, каб пасля не множыліся непаразуменні. Гэта, магчыма, і ёсць сакрэт шчаслівага жыцця, мяркуе Алена Аляксандраўна:



— Мы з самага дзяцінства вучым дзяцей, што калі мы з бацькам сыдзем, то толькі яны застануцца адно ў аднаго. З дочкамі ў нас такія адносіны, нібыта мы сяброўкі, яны дзеляцца са мной сваімі сакрэцікамі. І хлопчыкі расказваюць, якія дзяўчынкі ім падабаюцца. А ўвогуле дзеці аднолькава ставяцца і да мяне, і да бацькі. Спадзяюся, мы абодва ім аднолькава дарагія.

*(Заканчэнне на 4—5-й стар. «СГ».)*




# УСЁ ДЗЕЛІМ НАПАЛАМ

**Сям'я Качураў з Ліды — фіналісты ад Гродзенскай вобласці. Мама Людміла працуе ў медыцынскім цэнтры, тата Андрэй — на малочна-кансервавым камбінаце. Старэйшыя дачка Лера і сын Максім школьнікі, а малодшаму Мікіту нядаўна споўнілася тры гады.**



Творчы шлях сям'і пачаўся з таго, што Лера захацела паўдзельнічаць у школьным конкурсе «Міс Маленькая прынцэса».

— Мы з ёй прыдумвалі вершы, фасон сукенкі, стваралі нейкія калажы, я распрацоўвала танец, — успамінае Людміла Качура. — У выніку занялі першае месца, і класны кіраўнік прапанавала ўжо мне разам з дачкой паўдзельнічаць у конкурсе «Супер МАМА — 2018», дзе мы таксама перамаглі. На гэтым спаборніцтве нас прыкмеціла намеснік дырэктара школы па выхаваўчай рабоце і запрасіла паўдзельнічаць у раённым конкурсе на найлепшую сям'ю.

Конкурс сямейства выйграла, а адолеўшы наступную прыступку — абласны этап, — Качуры апынуліся ў фінале.

Натхняльнік і завадатар у сям'і Людміла, а вось астатнія клопаты — і бытавыя, і тыя, што датычацца выхавання дзяцей, — дзеляць напалам.

— Жывём душа ў душу, — пацвярджае Андрэй словы жонкі.

— Усе кажуць, што мне пашанцавала, што муж у мяне залаты, — смяецца жанчына. — У сям'і вельмі важная ўзаемадапамога. Шмат пар «з'ядаюць» бытавыя сітуацыі, калі лічыцца, што жонка павінна гатаваць, прыбіраць... павінна, павінна, павінна... А муж павінен працаваць. У нас не так, у нашай сям'і проста няма слова «павінен», бо мы ўсё дзелім пароўну.

У конкурсе сёлета будуць удзельнічаць усе разам. Хоць Мікіта яшчэ маленькі, ён падтрымлівае бацькоў ва ўсім.

— Слоў у яго па сцэнарыі няма, але спадзяёмся, што ён нешта пакажа на сцэне, будзе нейкі сюрпрыз. Ён вельмі рухавы, не стаіць на месцы больш за дзесяць хвілін. Для старэйшых дзяцей рэпетыцыі — гэта ўжо як мае быць, як у школу хадзіць, — смяюцца бацькі.

І ўдакладняюць: угаворваць нікога з малых не даводзіцца, дзецям самім цікава спрабаваць сябе ў розных кірунках.

— Максім «гарэў» футболам, прасіўся ў спартыўную секцыю і з чатырох гадоў займаецца. Дачка хацела плаванне — ідзі, пажадала танцы — танцуй, калі ласка. Ніколі такога не было, каб мы нешта ім прапаноўвалі: дзеці самі выбралі, што ўпадабалі, і ідуць па гэтым шляху.

А яшчэ сям'я актыўная ў сацыяльным плане. «Дапамагаем збірацца ў школу малым з дзіцячых дамоў: закупляем канцылярскія прылады, і нашы дзеці з задавальненнем нясуць іх у школу і складаюць у спецыяльныя скрыні. Збіраем асобна смецце, макулатуру, батарэйкі, накрыўкі», — пералічваюць бацькі.

Конкурс не толькі зрабіў жыццё сям'і больш разнастайным, але і даў шмат новых знаёмстваў. «Мы сустрэлі столькі таленавітых людзей! Яны падсілкавалі нас сваім пазітывам, паказалі, як правільна размаўляць, як рухацца на сцэне... Гэта, пэўна, самы вялікі плюс, што нам пашанцавала акунуцца ў такую атмасферу, — радуецца мама сямейства. — Тым больш гэта так адказна, бо мы ж удзельнічаем не толькі дзеля сябе, а і змагаемся за гонар нашага раёна, горада. А Лера вось спакойная. Нядаўна ў школе пажартавала: «Ай, чаго там... Я ведаю, што мы пераможам».

# СПАРТСМЕНЫ СТАНОВЯЦЦА АКЦЁРАМІ

**Хто б мог падумаць, што званок з тэрытарыяльнага цэнтра з прапановай паўдзельнічаць у конкурсе «Сям'я года» так моцна паўплывае на сям'ю Нікіціных з Гомеля!**

— Вельмі рэдка нам удаецца сабрацца разам, — прызнаецца маці Надзея Васілеўна. — То ў аднаго дзіцяці трэніроўка, то ў другога, у мяне работа ў тэатры, у мужа служба (Мікалай Анатолевіч працуе ў Дэпартаменце аховы МУС). Карацей, усе мы збіраемся толькі бліжэй да позняга вечара. А тут на рэпетыцыях столькі часу праводзім разам! Ёсць і яшчэ адзін станоўчы аспект. Я працую ў Гомельскім дзяржаўным тэатры лялек, і для мяне ўдзел у такім конкурсе — гэта не складаная, а зразумелая справа. Але ж на сцэну давядзецца выходзіць і маім дамашнім, і я бачу, што ім удалося лепш адчуць і зразумець мой стан, маю прафесію. Напрыклад, наш тата ўсвядоміў вельмі моцна, што праца акцёра нялёгкая. Я разумею, што яму цяжкавата: даводзіцца прыкладаць пэўныя намаганні, у чымсьці сябе крыху напружваць, таму што эмацыянальна гэта не яго. А дзеці ў нас спартсмены, і пабыць на сцэне ў якасці акцёраў — для іх вялікі крок у развіцці. Для мяне яны раскрыліся па-новаму, шмат чым уразілі. Яны звяртаюцца па парады. Больш стала цеплыні ў адносінах...




Бацькам Нікіціных лёс двойчы падарыў двайное шчасце. Спачатку нарадзіліся Дзяменцій і Дзмітрый, а праз тры гады — Эльвіра і Аліса. Усе дзеці дасягнулі высокіх спартыўных поспехаў, станавіліся прызёрамі гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх спаборніцтваў. Дзяменцій на прафесійным узроўні займаецца водным пола, Дзмітрый — скачкамі на акрабатычнай дарожцы, а дзяўчынкі абралі спартыўную акрабатыку.

Важныя рашэнні ў сям'і імкнуцца прымаць сумесна: ідэі могуць прапаноўваць усе, а ўжо большасцю галасоў выбіраюць, якая прапанова лепшая. «Мы імкнёмся дапамагаць адно аднаму, размяркоўваем хатнія абавязкі», — кажуць Нікіціны. Будаўнічыя, цяжкія работы — натуральна, старэйшыя хлопчыкі робяць разам з татам. Мама можа дапамагчы дзецям з урокамі. Эля адказвае за хатніх гадаванцаў — сабачак і папугая Кешу. А яшчэ, падкрэслівае Надзея Васілеўна, у сям'і вельмі важная ўзаемапавага. Для таго каб зразумець іншых, часам усяго толькі і трэба паставіць сябе на іх месца. Сямейнае шчасце ж, на думку Нікіціных, асаблівых сакрэтных складнікаў не мае: перадусім гэта агульная любоў, і не за што-небудзь, а проста таму, што яны ёсць адно ў аднаго.

# КРЫНІЦА НАТХНЕННЯ

МАЯ СЯМ'Я – МАЯ КРАІНА
СЯМ'Я 2019 ГОДА

**Мінскую вобласць на конкурсе прадстаўляе сямейна-творчы дэсант Івашкаў з Нясвіжа — мама Анастасія, тата Дзмітрый і пяць дачок: Мілана, Ульяна, Дзіяна, Паліна і Арышка, якой толькі ўвесну споўніўся годзік. У скарбонцы іх дасягненняў, акрамя перамог у раённым і абласным спаборніцтвах «Сям'я года», ёсць яшчэ выйграны летась раённы конкурс «Тата, мама, я — творчая сям'я», а таксама шматлікія граматы, дыпломы і падзякі з устаноў адукацыі, дзе займаюцца старэйшыя дзяўчаты.**



— Хто ў нас дома галоўны? Канешне, тата! — у адзін голас сцвярджаюць дзеці. Хоць не ўпускаюць магчымасці лісічкамі падласціцца і надаваць тату заказаў: каму касметыку прывезці, каму абноўку, каму цацку — хіба што не пунсовую кветачку.

— На ваш погляд, які найпершы сакрэт моцнай, шчаслівай сям'і?

— Захоўваць любоў і ўзаемаразуменне, сяброўскія стасункі паміж бацькамі і дзецьмі. А самае важнае, мабыць, — у любой складанай сітуацыі знайсці магчымасць, каб выслухаць праблемы кожнага, зразумець іх. Толькі здаецца, што на гэта не стае часу, насамрэч цалкам рэальна скласці распарадак дня, у якім на кожную справу будзе свой час і месца. Тым больш у дзяўчат ёсць свае абавязкі, тата вельмі дапамагае, бо ўжо ўсё ўмее: і выпякаць, і мыць бялізну, і коскі заплятаць. І, канешне, з любой будаўнічай работы даць рады. Майстар на ўсе рукі — гэта дакладна пра яго! — расказвае мама сямейства.

А яшчэ Дзмітрый Івашка любіць спяваць — у падлеткавым узросце ён атрымаў перамогу на абласным конкурсе мастацкай самадзейнасці, і гэта творчае захапленне захаваў да сёння. А мама Анастасія — генератар ідэй: яна піша сцэнарыі для выступленняў дачок, робіць адмысловыя прычоскі і прыдумляе рэцэпты тартоў, якія прыводзяць блізкіх у захапленне. Творчыя здольнасці праявіліся і ў дзяцей: шасцікласніца Мілана вучыцца на мастацкім аддзяленні Нясвіжскай дзіцячай школы мастацтваў, захапляецца танцамі і тэатрам, Ульяна вучыцца ў 4 класе звычайнай школы і ў мастацкай па класе фартэпіяна, спрабуе пісаць вершы, выступае ў складзе танцавальнага і тэатральнага калектываў. Дзіяна займаецца ў танцавальным гуртку, а Паліна марыць стаць артысткай. Магчыма, гэта будучы сямейны музычны або танцавальны калектыў? «А чаму не, — разважае Анастасія Івашка, — у нас практычна ў кожным пакаленні хтосьці іграе на музычных інструментах: мой бацька — на гітары, я вучылася на піяніна, сярод сваякоў ёсць майстры-баяністы, ёсць тыя, хто добра іграе на сінтэзатары... Ці пакажам мы гэтыя таленты на фінале ў Мінску? А вось прыходзьце — убачыце! Гарантуем кантраст эмоцый: і слёзы, і радасць, усё напоўніцу».

На рэспубліканскім конкурсе сям'я Івашкаў спадзяецца не толькі сябе паказаць, але і на іншых паглядзець, знайсці новых сяброў і атрымаць самыя прыемныя, яркія і станоўчыя ўражанні. «Галоўнае, што мы хочам сказаць: шматдзетная сям'я — гэта не праблема, не сацыяльная неўладкаванасць, як многія стэрэатыпна лічаць, а шчасце, радасць і бясконцае натхненне». Анастасія і Дзмітрый дакладна ведаюць, пра што кажуць: яны абодва самі выраслі ў шматдзетных сем'ях.

# ДЗЕСЯЦЬ ПЛЮС АДЗІН



**Мама Вольга, тата Дзмітрый і ажно васьмёра дзяцей, старэйшы з якіх Ягор ужо і сам жанаты і выхоўвае сына, а малодшая Міра яшчэ «дарастае» да дзіцячага садка. Усе разам яны — сям'я Бычкоўскіх, пераможцы сталічнага конкурсу «Найлепшая шматдзетная сям'я 2019 года» і прадстаўнікі Мінска ў фінале рэспубліканскага конкурсу «Сям'я года».**

Зрэшты, чакайце — ледзь не забыліся прадставіць яшчэ аднаго ўдзельніка: гэта выхаванец дзіцячага дома Паша. Бычкоўскія сталі для хлопчыка патранатнай сям'ёй і прызнаюцца, што ўжо лічаць яго цалкам сваім. Таму на сцэне Палаца прафсаюзаў выступяць усе разам — і, дарэчы, прэзентуюць сацыяльны праект, прысвечаны дзецям, якія з розных прычын засталіся без бацькоўскай апекі, таму ім асабліва патрэбныя клопат і душэўная цеплыня...

Бычкоўскім як удзельнікам асацыяцыі шматдзетных бацькоў прапаноўвалі паспрабаваць свае сілы ў «Сям'і года» значна раней, але ўсё нешта не складвалася: то дзеці яшчэ зусім маленькія былі, то часу і фізічных сіл не хапала, то адчування ўласнай гатоўнасці. А сёлета ім ёсць што сказаць і паказаць!

Яны апантаныя і творчыя, і ў кожнага ёсць свае таленты: бацька сямейства Дзмітрый Міхайлавіч — майстар арганізацыі сямейных падарожжаў, мама Вольга Віктараўна паралельна збірае некалькі калекцый: заморскіх слонікаў, мяккіх мядзведзяў і незвычайныя стравы розных народаў. Старэйшая дачка Ангеліна — пастаянная ўдзельніца і прызёрка спартыўных раённых спаборніцтваў, а таксама танцавальных конкурсаў, 5-класнік Прохар захапляецца брэйк-дансам і футболам, як і малодшы брат-другакласнік Ціхан, 4-класніца Кіра танчыць хіп-хоп, любіць спяваць і маляваць, будучая першакласніца Міхаліна з асалодай танчыць і малюе, Лія наведвае інтэлектуальны гуртов, а маленькая Міра бярэ ад усіх пакрысе.

Галоўны сакрэт шчаслівай сям'і, паводле Бычкоўскіх, у тым, што не бывае бясхмарнага шчасця з першага дня. «Мабыць, у першы год сумеснага жыцця «разводзіцца» ўсе. Але помніце: каб стаць жонкай генерала, трэба выйсці замуж за лейтэнанта і паматляцца з ім па гарнізонах. Гэтаксама ў любой сям'і: каб была прыгожая карцінка, трэба нястомна працаваць кожны дзень, вучыцца прымаць адно аднаго. Таму і сыну старэйшаму раім: пасварыліся — не маўчыце, гаварыце пра тое, што не задавальняе. Сям'я з гэтага і будуецца — не з пакрыўджанага маўчання, не з крыкаў і скандалаў, а з размоў пра ўсё, што падабаецца і не падабаецца».

У сям'і не дзеляцца на «галоўнага» і «падначаленых», і кожны робіць свой унёсак, хоць гэта жыццёвая мудрасць, зазначае мама Вольга, прыйшла далёка не адразу:

— Мы з мужам разам з 15 гадоў, і па маладосці ў кожнага былі свае цвёрдыя перакананні пра ролю мужа і жонкі, хто што павінен. З часам прыйшлі да таго, што муж у асноўным здабытчык, а хатняя праца пераважна на мне — але ён заўжды прыйдзе на дапамогу, калі не заняты па рабоце, з'ездзіць у краму і г. д. Часта бярэ з сабой Міру, бо яна практычна ніколі не капрызіць і не патрабуе «купі тое і гэта».

Часта цікавяцца, як у вялікай сям'і падзяліць бацькоўскую ўвагу і любоў на ўсіх. «А яе не трэба дзяліць, — лічаць Бычкоўскія, — любоў множыцца са з'яўленнем кожнага дзіцяці, бо яна ідзе ад сэрца, і сваё дзіця ты будзеш любіць і ў сем месяцаў, і ў сем гадоў, і ў 70, проста па-рознаму».

— У нас так атрымлівалася, што нараджаліся якраз тыя дзеці, якіх мы з мужам хацелі: хацелі дзяўчынку — дзяўчынка, планавалі хлопчыка — калі ласка, да таго ж усе дзеці былі вельмі спакойныя, як па кніжках, — смяецца Вольга Бычкоўская. — Магу толькі пажадаць усім, каб дзеці нараджаліся запланаванымі і чаканымі, і яшчэ, канешне, здаровымі: напэўна, гэта для любой маці самае важнае.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ, Ірына СІДАРОК, Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

| | |
|---|---|
| Организатор торгов | **ООО «Расантехторг»** ( УНП 191514793), 220108, г. Минск, ул. Корженевского, д. 14, оф. 404, 8029-670-30-84; **WWW.TORGI24.BY** |
| Продавец | **ООО «МЕДАКС-М»** (УНП 590906064) в лице управляющего по делу о банкротстве – индивидуального предпринимателя Синкевич Е. Н., г. Минск, ул. Скрыганова, 6/2, пом. 3 |
| Форма, дата, время и место проведения торгов | Четвертые повторные торги в форме открытого аукциона в электронной форме **04.11.2019 в 9.00** на электронной торговой площадке **WWW.TORGI24.BY,** окончание торгов **04.11.2019 в 17.00** |
| Сведения о предмете торгов, порядок ознакомления с ним | Лот № 1: **капитальное строение с инв. номером 420/С-34994, год постройки – 1983, общая площадь – 1 254,5 м$^2$, назначение – здание неустановленного назначения, включая составные части, принадлежности и неотделимые улучшения, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Третьяковский с/с, 12, завод ООО «Медакс-М» в районе д. Минойты – 271 200,00 белорусских рублей без НДС** |
| Начальная цена предмета торгов | **Лот № 1 = 271 200,00 белорусских рублей** |
| Порядок проведения торгов | Сумма шага торгов составляет 5 % от начальной цены торгов. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Победителю торгов в течение 1 дня со дня проведения торгов на адрес электронной почты направляется извещение о возмещении затрат на организацию и проведение торгов, акт о проведенных торгах, а также для подписания протокол о результатах торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Непредставление организатору торгов в течение 5-дневного срока письменного согласия на приобретение предмета торгов расценивается организатором торгов как отказ от приобретения предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за 5 дней до наступления даты проведения торгов |
| Размер, порядок и сроки внесения задатка, место, дата и время приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов | Сумма задатка для участия в торгах составляет 10 %: **Лот № 1 = 27 120,00 бел. рублей.** Для участия в торгах необходимо в срок **по 01.11.2019** перечислить задаток на расчетный счет № **BY56UNBS30120893600010000933** в ЗАО «БСБ Банк», г. Минск, код **UNBSBY2X**, УНП 191514793, получатель – ООО «Расантехторг»; подать заявку на участие в торгах на сайте: **WWW.TORGI24.BY**; направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: rasantehtorg@tut.by (подробнее – в информации лота на сайте **WWW.TORGI24.BY**. Последний день внесения задатка – **01.11.2019 г.** |
| Возмещение затрат | Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения на основании представленного организатором торгов извещения о возмещении затрат (подробнее на сайте **WWW.TORGI24.BY)** |
| Ранее опубликованные извещения | Журнал «Судебный вестник Плюс: экономическое правосудие» за 2019 год: № 1 – с. 63–64, № 4 – с. 64, № 6 – с. 61, № 8 – с. 57–58 |

Страховые полисы по добровольному страхованию «Универсальные» серии ПЕ № 0364944, 0364945, 0364946 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительными в связи с утерей.**

УНП 190660583

# Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества предприятия, находящегося в процедуре ликвидации по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) – Витебского ОАО «КИМ»

**Продавец и организатор аукциона:** управляющий в производстве по делу о банкротстве Ивченко М. М., тел. 64 83 35 (+375336750001), г. Витебск, ул. М. Горького, 42.

**Лот 1:** Кап. строение с инв. № 200/С-64177, наименование «Административный корпус с пристройкой», общей площадью 4178,2 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, 42/1 (с учетом составных строений и их составных элементов и принадлежностей: цокольный этаж, подвал, пристройка, подвал, тамбур, сход в подвал, ограждение, ворота, ограждение); кап. строение с инв. № 200/С-97125, наименование – «Отстойник» (доля в праве собственности 1/10), наружной площадью – 47 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, отстойник вблизи здания № 42/20; кап. строение с инв. № 200/С-97495, наименование – «Водопроводная сеть» (доля в праве собственности 1/17), протяж. – 2508,2 м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, водопроводная сеть к зданиям №№ 42/1, 42/2, 42/3, 42/4, 42/7, 42/8, 42/13, 42/15, 42/16, 42/18, 42/22, 42/24, 42/26, 42/27, 42/29, 42/30, 42г; кап. строение с инв. № 200/С-97512, наименование – «Тепловая сеть» (доля в праве собственности 1/13), протяж. – 1269,8 м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, тепловая сеть; кап. строение с инв. № 200/С-97511, наименование «Канализационная сеть» (доля в праве собственности 1/12), протяж. – 2691,5 м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, канализационная сеть; кап. строение с инв. № 200/С-97506, наименование – «Ливневая канализационная сеть» (доля в праве собственности 1/10), протяж. – 1899,4 м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, ливневая канализационная сеть; кап. строение с инв. № 200/С-97505, наименование – «Сеть наружного освещения», протяж. – 42,5 м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, сеть наружного освещения вблизи здания 42/1; Сооружение, наименование – «Навес», общей площадью 52 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, 42/43. **Нач. цена**: 371 564,00 бел. руб. без НДС. **Задаток:** 37 156,40 бел. руб.

Аукцион состоится **12 ноября 2019 в 10.30** по адресу: Витебск, ул. Максима Горького, д. 42 (здание военизированной охраны). Заявления и документы на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 11.10.2019 по 11.11.2019 г. с 08.30 до 16.30. Официальные извещения о проведении аукционов опубликованы в газете «Звязда» от 10.10.2019 № 193.

Информация о торгах размещена на сайте **www.bankrot.gov.by.** Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым № 240100000003001399, пл. 9,9940 га, который является неделимым и после продажи недвижимого имущества будет предоставлен в общую долевую аренду. **УСЛОВИЕ** аукциона: победитель аукциона или единственный участник аукциона, подавший в установленном порядке заявление на участие в аукционе и изъявивший желание приобрести объект аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, возмещает фактические затраты по организации и проведению аукциона по ранее проведенным нерезультативным, несостоявшимся аукционам. **1.** Аукцион проводится в соответствии со ст. ст. 127–129 Закона Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условие – наличие не менее 2 участников. В случае признания торгов несостоявшимися по причине подачи заявления только одним участником, предмет аукциона может быть продан этому участнику с его согласия с 5 % шагом, возмещением затрат по аукциону и выполнением условий аукциона. Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения в любое время, но не позднее 5 дней до даты проведения. Порядок участия и проведения аукциона в соответствии со ст.ст. 127–129 Закона Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». **2.** Шаг аукциона устанавливается в размере 5 % в фиксированной сумме от начальной цены продажи каждого объекта. **3.** Задаток в размере 10 % перечисляется на р/с BY60BLBB30120300200516001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской области, BIC BLBBBY2X, УНП 300200516. Получатель платежа: Витебское Открытое Акционерное Общество «Классика индустрии моды». **4.** Победитель возмещает затраты по организации и проведению аукциона, которые сообщаются участникам до начала проведения аукциона и подлежат уплате в течение 3 дней после проведения аукциона. Победитель аукциона обязан заключить договор купли-продажи с Продавцом в течение 7 дней со дня проведения аукциона, оформления результатов несостоявшегося аукциона. Срок оплаты – 14 дней с даты проведения аукциона, рассрочка не предоставляется.

Дополнительная информация по телефонам: 80212 64 83 35, + 375336750001

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

# Извещение о проведении электронных торгов

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| Продавец | Несвижское райпо, Минская обл., Несвижский р-н., г. Несвиж, ул. Советская, 5/1 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 4б |
| Адрес ЭТП | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**
**Капитальное строение, расположенная по адресу: Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, д. Войниловичи, ул. Несвижская, 22**

| Наименование (назначение) | Общ. площадь | Инвентарный № |
|---|---|---|
| Магазин № 24 (Здание специализированное розничной торговли). Составные части и принадлежности: целое одноэтажное кирпичное здание магазина А1/к со складом № 1, уборной № 2 | 267,3 кв. м | 621/С-1027454 |

**Сведения о земельных участках:**
**1.** Предоставлен на праве аренды для обслуживания обслуживание магазина № 24, общ. пл. 0,0727 га, сроком до 04.02.2070.
Ограничения (обременения): природные территории, подлежащие специальной охране – водоохранная зона реки, водоема, площадью 0,0727 га; охранная зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадью 0,0010 га.
**2.** Предоставлен на праве аренды для обслуживания обслуживание магазина № 24, общ. пл. 0,0002 га, сроком до 04.02.2070.
Ограничения (обременения): природные территории, подлежащие специальной охране – водоохранная зона реки, водоема, площадью 0.0002 га; мелиорируемые (мелиорированные) земли, площадью 0,0002 га

**Начальная цена(с НДС 20 %) – 41 029,63 белорусского рубля**

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Страшко Дарья Александровна, контактные тел.: + 375 (44) 572-81-93, +375 (1770) 6 82 95

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней после электронных торгов** |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, а так же оплатить установленное вознаграждение Организатору торгов в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 12.11.2019** в 11.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» **(www.ipmtorgi.by)**

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): 11.11.2019** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by)**

**Контактные телефоны: + 375 17-280-36-37; +375 29-704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

# ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Дрогичине

| Номер лота | Адрес участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение использования земельного участка | Срок аренды, лет | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. | Наличие инженерных коммуникаций на прилегающей территории. Наличие ограничений в использовании земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Дрогичин, ул. Независимости, 57 | 122050100001004824 | 0,0961 | строительство и обслуживание магазина (продовольственные товары) | 50 | 4999,18 | 499,92 | 228,00 плюс расходы за объявление в газету | Возможность подключения ЛЭП, водопровода, газопровода |
| 2 | г. Дрогичин, ул. Юбилейная, 44А | 122050100001004697 | 0,01 | строительство объекта торговли (непродовольственная группа товаров) | 50 | 513,98 | 51,40 | 906,42 плюс расходы за объявление в газету | Возможность подключения ЛЭП, водопровода, газопровода |
| 3 | г. Дрогичин, ул. Ленина, 2Г | 122050100001005114 | 0,0070 | строительство и обслуживание объекта торговли | 50 | 358,67 | 35,87 | 1395,32 плюс расходы за объявление в газету | Возможность подключения ЛЭП, водопровода, газопровода, канализации. Земельный участок не имеет ограничений в использовании |
| 4 | г. Дрогичин, ул. Ленина, 2Д | 122050100001005115 | 0,0070 | строительство и обслуживание объекта торговли | 50 | 358,67 | 35,87 | 1395,32 плюс расходы за объявление в газету | Возможность подключения ЛЭП, водопровода, газопровода, канализации. Земельный участок не имеет ограничений в использовании |
| 5 | г. Дрогичин, ул. Ленина, 2И | 122050100001005118 | 0,0100 | строительство и обслуживание объекта торговли | 50 | 512,38 | 51,24 | 1395,32 плюс расходы за объявление в газету | Возможность подключения ЛЭП, водопровода, газопровода, канализации. Земельный участок не имеет ограничений в использовании |

Сумма задатка для участия в аукционе перечисляется на счет Дрогичинского райисполкома (УНП 200072979) № BY62AKBB36411060600481300000, код AKBBBY21802 в ЦБУ № 108 филиал № 802 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Дрогичин, получатель – Дрогичинский районный исполнительный комитет, назначение платежа – внесение задатка для участия в аукционе

Аукцион состоится 30 октября 2019 г. в 10.00 по адресу: г. Дрогичин, ул. Ленина, 138, каб. 30.
Заявления для участия в аукционе принимаются по адресу: г. Дрогичин, ул. Ленина, 138, кабинет 32, с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, кроме субботы, воскресенья и праздничных дней.
Прием заявлений начинается в день публикации и заканчивается 24 октября 2019 г. в 16.00. Контактный телефон 3 58 29

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукциона на право заключения договора аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г., № 462, и состоится при наличии не менее двух участников.

Участниками аукциона по лотам 1, 2, 3, 4, 5 могут быть граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица.

Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального освидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором аукционных торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном протоколом аукционных торгов, внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Оплата цены продажи предмета аукциона может быть осуществлена в рассрочку в соответствии с решением Дрогичинского райисполкома от 26 ноября 2018 г. № 1264;

в течение 2 рабочих дней после перечисления платежей заключить с Дрогичинским райисполкомом договор аренды земельного участка;

